№№75–76
(2803–2804)

22 мая 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

БЛІЦ

Ці прызнае еўрапейская супольнасць будучы беларускі парламент легітымным, калі ў выбарчыя камісіі не будуць уключаны прадстаўнікі дэмакратычнай грамадскасці?

Юрый БАРАНЧЫК, кандыдат філасофскіх навук, былы супрацоўнік Акадэміі кіравання пры прэзідэнце:

— Мяркую, што прызнаюць, калі ў склад новага парламента трапіць пяць-сем апазіцыянераў. Мне падаецца, што для Еўрапейскага Саюза гэта будзе сведчаннем таго, што беларускія ўлады ідуць у правільным накірунку, робяць невялікія крокі наперад...

Лявон БАРШЧЭЎСКІ, старшыня Партыі БНФ:

— Думаю, што не прызнае яшчэ і таму, што ў Беларусі сродкі масавай інфармацыі знаходзяцца пад прыгнётам. І гэта ўжо сёння дае падставу не прызнаваць выбары ў Палату прадстаўнікоў легітымнымі. Бо выбары — гэта ж не толькі галасаванне і падлік галасоў. Гэта яшчэ і магчымасць весці агітацыю, свабодна распаўсюджваць прэсу. А зрабіць гэта ў сённяшніх беларускіх умовах нельга. І калі ўлада не будзе рабіць ніякіх крокаў у гэтым накірунку, то не варта чакаць аніякага еўрапейскага прызнання...

Святлана ЭСПАН, гандлярка:

— Шчыра кажучы, мне ўсё роўна, хто будзе ўключаны ў выбарчыя камісіі. Я мала веру ў тое, што беларускія выбары могуць быць бездакорнымі і справядлівымі. Магчыма, я памыляюся, але мне здаецца, што нават калі і ўключаць у выбарчыя камісіі прадстаўнікоў апазіцыі, то агульныя лічбы па краіне будуць не на карысць дэмакратычнай грамадскасці. А хто ў гэтым вінаваты — гэта, відаць, ужо тэма для іншай дыскусіі.

Дзмітрый БАЦЮКОЎ, пластычны хірург:

— Адкажу коратка: думаю, што не прызнаюць.

Іван КАСЦЯХІН, дырыжор:

— Вельмі правакацыйнае пытанне, трэба крыху падумаць... Вы ведаеце, думаю, усё роўна прызнаюць, як гэта ні парадаксальна. Таму што ў любым выпадку будуць з абодвух бакоў шукаць магчымасці для кантактаў. Улада падчас вядзе сябе даволі жорстка. Але ёсць, відаць, саступкі, пра якія мы не ведаем. І ўвогуле, я лічу, што мы ведаем толькі тое, што нам даводзяць у пэўны момант. А што насамрэч адбываецца...

Людміла ГРАЗНОВА, праваабаронца:

— У мінулы раз выбары не былі прызнаны легітымнымі не толькі з-за таго, што ў выбарчых камісіях не было прадстаўнікоў апазіцыі, але і па іншых параметрах. Адчуваецца, што мінулыя ўрокі не пайшлі на карысць цяперашняй уладзе. Таму меркаваць, што будучыя парламенцкія выбары будуць прызнаныя легітымнымі, на мой погляд, няма падстаў. Але тым не менш заўсёды спадзяешся: а раптам нешта зменіцца? Раптам чыноўнікі зразумеюць, што інтэграцыя ў еўрапейскую прастору пойдзе на карысць усяму беларускаму народу, у тым ліку і цяперашняй уладзе.

Жанна ДЗМІТРЫЕВА, выхавацелька дзіцячага садка:

— Прабачце, але мяне зараз хвалююць іншыя рэчы: як выжыць. Я працую з сямі раніцы да сямі вечара. Прыходжу дамоў і з ног валюся. Зарабляю прыблізна каля пяцісот тысяч беларускіх рублёў. Кожныя выхадныя езджу на дачу, бо для мяне танней вырасціць агуркі і перцы, чым набыць. Мяне не хвалююць выбарчыя камісіі, бо нават калі ў парламент прыйдзе дзесяць апазіцыянераў, сумняваюся, што маё асабістае жыццё зменіцца да лепшага. Я як жыла на гэты заробак, так і буду жыць... Спадзяюся, што хоць маім праўнукам будзе лягчэй...

Алесь ЛАГВІНЕЦ, памочнік экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча:

— Гэта будзе залежаць ад таго, ці будзе дазволена беларускім і замежным назіральнікам сачыць за выбарчым працэсам, за тым, як будуць падлічвацца галасы. Відавочна, што гэтае рашэнне беларускіх улад вельмі істотна паўплывае на факт прызнання альбо непрызнання легітымнымі гэтых парламенцкіх выбараў.

Марына КОКТЫШ.

ПЕРЕГОВОРЫ

Дерипаска интересуется МАЗом

Самый богатый российский бизнесмен Олег Дерипаска обсуждает с властями Беларуси возможность приватизации "Минского автозавода" (МАЗ). Об этом сообщил "Интерфаксу" информированный источник в правительственных кругах.

Олег Дерипаска провел переговоры с представителями белорусских властей по поводу создания на базе подконтрольной ему группы компаний "Русские машины" и МАЗа машиностроительного холдинга. Непосредственно российский предприниматель предлагает объединить в единую производственную структуру МАЗ и "Автомобильный завод "Урал" (Челябинская обл., Миасс) -- производителя автомобилей повышенной проходимости марки "Урал".

Александр Лукашенко на встрече с российским олигархом заявил, что считает перспективной реализацию совместных проектов с ОАО "Русские машины", в частности, с участием "Минского автомобильного завода". Однако о своем согласии на продажу МАЗа пока ничего не сказал.

Как сообщалось ранее, белорусское правительство рассматривает возможность акционирования МАЗа, но не как самостоятельного предприятия, а в составе производственного объединения "БелавтоМАЗ", головным предприятием которого МАЗ является. В состав ПО также входят РУП "БААЗ" (Барановичи), РУП "ОЗАА" (Осиповичи), РУА "КЗТШ" (Жодино), РУП "Литмаш" (Минск), ПРУП "ДЭМЗ" (Дзержинск), РУП "СтройМАЗтрест" (Минск). Чем закончились переговоры Александра Лукашенко и Олега Дерипаски, пока неизвестно.

Пуцін прыедзе ў Мінск

Пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў-удзельніц СНД пройдзе ў Мінску 23 мая.

Упершыню ў ім будзе ўдзельнічаць у якасці прэм'ер-міністра экс-прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін.

Паведамляецца, што павестка дня нарады ўключае 20 пытанняў — ад эканамічнага і фінансавага ўзаемадзеяння да прававога статусу працоўных мігрантаў.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Упреки истории

В конце апреля, перед Пасхой, мы с женой и внучкой поехали на Восточное кладбище, навести порядок на могиле тестя, давно и рано умершего военного летчика.

—...А вот и неправда, Машеров был президентом...

Я оглянулся. С десяток ребят, мальчишек и девчонок, медленно двигались по тесному проходу между могил, вслух читая имена на памятниках, высчитывая годы жизни усопших...

Я окликнул их:

— О чем спор?

— Да вот, Витька говорит, что Машеров был вице-премьером. А ведь вице-премьер — не главный, главный — президент. А потом он умер и президентом стал Лукашенко...

Оказалось, пятиклассники одной минской школы пришли на кладбище прибрать воинские захоронения. Вынесли мусор, подмели дорожки... Потом учительница водила их к могилам известных людей вдоль главной аллеи, к могиле Машерова. А потом самые любопытные остались, ушли в заросли...

Я, конечно, рассказал им про Машерова, провел, так сказать, урок истории, вспомнив далекие послеуниверситетские годы учительства в сельской школе на благословенной Браславщине. Если и был наполнен смыслом тот краткий период биографии, то главную его часть можно назвать одним именем — Янек...

У этого пацана пятнадцати лет были по-волчьи острые, прижатые к голове уши, и колючий настороженный взгляд. Сам он был не по годам мал, тщедушен, но все из ряда вон, что происходило в деревне, — от забитой дохлой вороной печной трубы до магазинной кражи, — валилось на него...

Мы подружились. Он приходил ко мне играть в шахматы, я давал ему книги... Однажды зашел к нему. На кровати, под кучей тряпья, лежала больная мать.

— Хто тут? Настаўнік? Дапамажыце, настаўнік, загіне хлапец... Каб жывы быў бацька...

Батька Янека смотрел на меня с пожелтевших фотографий, помещенных по деревенскому обычаю в одну раму, висящую на беленой известью, тоже пожелтевшей, стене. Вот он держит под уздцы лошадь, стараясь напряженной стойкой "смирно" соответствовать форме польского жолнежа, увенчанной конфедераткой. А вот сидит в той же форме, держа на коленях саблю...

В последний раз деревню жгли в 1953 году. Отец Янека сам застрелил тогдашнего председателя сельсовета, мужа учительницы, которая и спустя десять лет работала завучем школы. Янек был ее личный враг: тюрьма, колония — не самое страшное, что готовило ему ее поврежденное неутоленной местью сознание...

Отец Янека погиб в том же 1953-м, когда их отряд "лесных братьев" обложили со всех сторон.

В октябре, когда осины горят багряно-кровавым огнем, Янек повел меня в лес, в непознаваемую его глубь. На поляне, до которой мы добрались спустя часа три, сохранились еще полуразрушенные землянки, следы от костров, раскиданы были остатки какой-то амуниции, треснутые котлы, ведра, на деревьях вокруг видны были позеленевшие отверстия от пуль...

Нет, это не я преподавал ему Историю. Это он преподавал ее мне, юноше из благополучной столичной семьи.

И когда зимой с ее невиданными больше морозами и снегами Янек исчез, я уже знал, где его искать...

...Вряд ли я смогу толком объяснить, почему вспомнил Янека сегодня, когда узнал о том, что история Беларуси отдельно преподаваться не будет, а будет преподаваться "в контексте всемирной истории". С учительством я расстался давно, методиками не владею, уверенно говорить о том, что подобная трансформация вредна для образования или полезна, не берусь. Для меня гораздо важнее, чтобы в этом захлебе от нововведений не потерялся Янек.

Не потерялась расстрелянная советскими партизанами деревня Дражно Стародорожского района. И не потерялось постыдное судилище над теми, кто хотел сохранить о ней память.

Не потерялась трагедия Машерова и его имени.

Ничто не потерялось за наши тысячи лет...

Всегда был уверен, а сегодня уверен абсолютно: гораздо важнее исторического знания чувство истории. Факты, даты, события, ежели забылись, всегда можно вспомнить и уточнить — доступных источников предостаточно. Но без чувства не будет подвига к знанию.

Без чувства история останется мертва. А мертвую историю всегда можно использовать на потребу. Еще раз посмотрите учебники истории, по которым сегодня учатся ваши дети. Я посмотрел. Это советские учебники, хоть и названы "Гісторыя Беларусі". Точнее, образчики постсоветской идеологической конъюнктуры.

Учась по этим учебникам, невозможно извлечь уроки из давней и не очень давней истории.

Невозможно извлечь уроки из истории, если не осознать и не прочувствовать ее упреки — за беспамятство, за вранье, за попытки заточить ее в новые бетонные стены и закатать под новый асфальт...

А Янеку я все-таки помог, уберег от колонии и тюрьмы. После восьми классов он поступил в ПТУ, писал письма оттуда, однажды написал про то, как его заподозрили в воровстве. Директором ПТУ был мой сокурсник, его легко было переубедить. Потом Янек работал механизатором в колхозе, потом уехал в Латвию — многие из браславских мест на излете советских лет искали там работу, устроенный быт и семейное счастье.

Там, в Латвии, и затерялся его след.

Попал в контекст всемирной истории...

kamerton_41@mail.ru

ФАКТ

И все-таки мы вымираем

Несмотря на победные реляции о беби-буме, который наблюдается в стране, число белорусов неизменно сокращается.

На 1 апреля нынешнего года в стране проживало только 9 млн 681 тыс. человек. Как сообщает Министерство статистики и анализа, за первые три месяца этого года численность жителей республики уже уменьшилась на 8,8 тыс. человек.

JOB VACANCY: BRITISH EMBASSY

The British Embassy in Minsk is seeking to recruit a temporary Entry Clearance Assistant.

Candidates should have initiative, good interpersonal skills, enthusiasm and a high standard of self-presentation. Candidates should be computer literate, and have excellent spoken and written English. Previous, relevant, work experience is desirable.

The position will involve a wide range of work in support of the Entry Clearance Officer's activities. The main purpose of the job is to assist the Entry Clearance Officer in all aspects of visa and Consular work providing a fast, efficient and effective service. This will focus on the following responsibilities: accurately interpreting during interviews and translating supporting documentation when required; responding to written and telephone inquiries appropriately; providing accurate information about entry clearance matters; and clerical support.

Working hours will be from 0900 to 1730 Monday to Thursday and from 0900 to 1500 on Friday.

Applications, including CVs, should consist of no more than two pages, and should be sent to the address below in an envelope marked "Application for Entry Clearance Assistant Vacancy." References may be included. The deadline for applications is 28 May 2007. Selected candidates will be called for interview shortly thereafter. The appointment will commence in June 2008 and last until September 2008. Unsuccessful candidates will not be contacted.

The Management Officer, British Embassy, 37 Karl Marx Street, Minsk, 220030

СУД

Вязні лагера «Азарычы» прайгралі суд Адміністрацыі прэзідэнта

Зусім нядаўна Беларусь адсвяткавала чарговы Дзень Перамогі. Колькі было сказана цёплых слоў пра герояў і ахвяр таго жудаснага часу. Але, здаецца, што існуючая ўлада ўспамінае пра іх толькі з гэтай нагоды.

Літаральна праз некалькі дзён пасля 9 Мая ў судзе Ленінскага раёна Мінска адбыўся беспрэцэдэнтны судовы працэс — былыя вязні лагера смерці "Азарычы" падалі іск супраць Адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі. Трынаццаць істцоў, якія ў гады вайны былі дзецьмі і прымусова ўтрымліваліся ў лагеры "Азарычы", на працягу васьмі гадоў безвынікова дабіваліся сустрэчы з кіраўніком дзяржавы. "У 1992 годзе ў Беларусі быў прыняты Закон аб ветэранах, — гаворыць адзін з ініцыятараў звароту ў суд Аркадзь Шкуран. — У ім малалетнія вязні канцэнтрацыйных лагераў прыраўніваліся да ўдзельнікаў вайны. Праз тры гады навукова-кваліфікацыйнай камісіяй, якая была ўтворана па загадзе Адміністрацыі прэзідэнта, сваім рашэннем пазбавіла лагер "Азарычы" статуса канцэнтрацыйнага. Гэта пазбавіла нас права карыстацца льготамі, прадугледжанымі законам".

Былыя вязні вайны вырашылі так. Паколькі навукова-кваліфікацыйная камісія ўтворана з лёгкай рукі Адміністрацыі прэзідэнта, то і звяртацца з тым, каб статус "Азарычаў" быў перагледжаны, трэба менавіта туды. "Распачалася перапіска, — працягвае Аркадзь Шкуран. — Праўда, да ўсіх нашых зваротаў у Адміністрацыі ставіліся фармальна. Як правіла, нам на рукі прыходзілі адпіскі альбо нашыя звароты наогул не разглядаліся, а спускаліся ў ніжэйшыя інстанцыі — у Беларускі рэспубліканскі фонд "Узаемапаразуменне і прымірэнне", альбо у Камітэт па архівах і справаводстве. У той жа час гэтыя арганізацыі не надзелены кампетэнцыяй, каб перагледзець статус "Азарычаў". І выйшла так, што падчас Нюрнбергскага працэсу лагер "Азарычы" быў прызнаны канцэнтрацыйным, а нам паведамлялі, што гэтае рашэнне для Беларусі не мае юрыдычнай сілы".

Зразумела, што былым малалетнім вязням "Азарычаў" не ўдалося сустрэцца з Аляксандрам Лукашэнкам. Не дапамог нават прамы зварот у прыёмную кандыдата ў прэзідэнты Лукашэнкі падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў.

"Колькі можна было трываць? Усе гэтыя адпіскі з Адміністрацыі прэзідэнта інакш, як здзекам і праявай бесчалавечнага стаўлення да грамадзян назваць нельга, — абураецца Аркадзь Шкуран. — І мы вырашылі звярнуцца ў суд".

На судовае пасяджэнне прадстаўнікі Адміністрацыі прэзідэнта не з'явіліся. Ці не гэта яскрава сведчыць аб сапраўдным стаўленні "государевых мужей" да ахвяраў вайны?

Суддзя Ленінскага суда Мінска Таццяна Жулкоўская разгледзела іск за адзін дзень. Імем Рэспублікі Беларусь Жулкоўская адмовіла ў задавальненні іску. Суд не задаволіў патрабаванні істцоў і ў частцы кампенсацыі ім маральнай шкоды, нанесенай бесчалавечнымі адносінамі з боку чыноўнікаў, якую былыя вязні ацанілі ў 20 мільёнаў рублёў на кожнага.

Суд таксама ўказаў, што дзеянні чыноўнікаў Адміністрацыі Лукашэнкі правільныя, бо "закон аб зваротах грамадзян" дазваляе "спускаць" звароты ў ніжэйшыя, хай сабе і некампетэнтныя ў пэўных пытаннях інстанцыі.

Істцы рашэннем суда не задаволены. Яны збіраюцца яго абскарджваць. Толькі ці будзе з гэтага плён — пытанне хутчэй рытарычнае...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ГОРЯЧАЯ ТЕМА

Услышит ли президент народ?!

В течение года в Пуховичском районе идет противостояние властей и жителей населенных пунктов, прилегающих к предполагаемому месту строительства завода по производству средств защиты растений ЗАО "Август-Бел", а проще — завода ядохимикатов. Чиновники дали разрешение на строительство экологически вредного предприятия в густонаселенном регионе. Противостояние дошло до фактического объявления чиновниками холодной войны населению. Эти люди, включая работников правоохранительных структур, курсируют по предприятиям и угрозами пытаются вынудить рабочих и инженерно-технических работников прекратить протесты.

В эту войну чиновники уже втянули работников близлежащих предприятий, но она вот-вот перейдет границы школ, жилых домов, деревень. Граждане региона неоднократно обращались в различные инстанции с заявлениями, обращениями, письмами. В течение нескольких дней было собрано и направлено в Совет министров более 5000 подписей против предполагаемого строительства, но голос народа так и не был услышан. Результаты этого противостояния предусмотреть сложно, а как выяснилось, и некому. Но ведь в Беларуси есть специалисты и аналитики, способные не только видеть личную выгоду, но и умеющие прогнозировать перспективу. Еще в 2006 году белорусские ученые предупреждали об экологических, экономических, социальных последствиях строительства экологически вредного предприятия в густонаселенной зоне. Но это предупреждение просто проигнорировано.

Граждане населенных пунктов Дружный, Дукора, Дричин, Свислочь, Руденск, обратившиеся с заявлениями в Совет министров и к президенту страны, пока считают, что их обращения не дошли до адресатов. А потому на стихийном собрании (более 2000 человек) решили обратиться к главе государства через СМИ. Текст этого обращения простой. Его озвучила жительница поселка Дружный Татьяна Рысивец. Получилось экспромтом, но очень убедительно.

"Александр Григорьевич!

Вы — гарант Конституции и демократии в Республике Беларусь!

Защитите нас от чиновничьего произвола, не дайте экспансии российского капитала погубить наше здоровье. Мы хотим всего лишь чистой воды, чистой земли, чистого неба! Не допустите трагедии, подобной той, что произошла в Белграде после взрыва завода пестицидов "Галеника". Услышьте нашу боль и крик наших сердец!"

Услышит ли?

К письму приложено 6000 подписей.

Сергей ОБРАЗОВСКИЙ.

ПАДЛІЧЫЛІ

У дваіх беларусаў — па 7 кватэр

Па статыстычных звестках, на пачатак года па дзве кватэры мелі ва ўласнасці 53.522 грамадзяніны Беларусі.

Па тры кватэры маюць 2074 нашы суайчыннікі, па чатыры — 127, па пяць — 11, па шэсць — 2, па сем кватэр — таксама 2 чалавекі.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 МАЯ 2008 г.

РЭЙТЫНГ

Беларусь трапіла ў спіс самых няшчасных краін свету

Інтэрнет-партал World Database of Happiness (Сусветная база звестак пра шчасце) выклаў вынікі даследаванняў, у якіх назваў самыя шчаслівыя і няшчасныя краіны свету.

Аўтары працы разглядалі 95 дзяржаў. Сярод самых няшчасных краін першымі сталі Беларусь і Малдова. Пасля значацца Узбекістан, Руанда і Зімбабве.

Паводле атрыманых звестак, першыя пазіцыі ў незвычайным хіт-парадзе шчаслівых краін займаюць Швейцарыя і Данія. За імі ў рэйтынгу ідуць Аўстрыя, Ісландыя, Фінляндыя, Аўстралія, Швецыя, Канада, Гватэмала, Люксембург, Ірландыя, Мексіка і Нарвегія.

World Database of Happiness — інтэрнет-партал, дзе сабраны матэрыялы, прысвечаныя навуковаму вывучэнню шчасця. Яго стварылі універсітэт Эразма Ратэрдамскага ў Нідэрландах і Рут Вэнховен — сацыёлаг і псіхолаг. Вэнховен зацікавіўся пытаннем, што такое шчасце і як яго дасягнуць, калі быў яшчэ студэнтам. У канцы 90-х гг. ён заснаваў свой партал у інтэрнеце, куды рэгулярна выкладаюцца псіхалагічныя і сацыялагічныя даследаванні па гэтым актуальным пытанні.

БЕЛАРУСЬ—ЗША

За амерыканскай візай — у Ерэван

"Я не магу сказаць, калі мы зможам аднавіць аказанне візавых паслуг у Мінску", — заявіў Часовы Павераны ў справах ЗША ў Беларусі Джонатан Мур падчас анлайн-канферэнцыі на сайце газеты "Комсомольская правда" в Белоруссии".

Дж.Мур нагадаў, што пасольства прыпыніла выдачу віз у сувязі з патрабаваннем беларускіх улад скараціць колькасць амерыканскіх дыпламатаў у Мінску.

"Беларусы могуць падаваць дакументы на атрыманне візы ў пасольствы ЗША ў сумежных краінах. Напрыклад, у Маскве, Кіеве, у нашым консульстве ў Санкт-Пецярбургу. І нават, калі хтосьці не супраць такой далёкай паездкі, у пасольствы ЗША ў Ерэване і Тбілісі", — сказаў Дж.Мур.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што пасольства ў Беларусі працягвае выдаваць *"некаторыя катэгорыі віз у Мінску, уключаючы экстранныя выпадкі"*.

Адказваючы на пытанне аб ступені ўплыву цяжкасцяў у беларуска-амерыканскіх адносінах на прыняцце рашэння аб выдачы візы грамадзяніну Беларусі Дж.Мур сказаў: *"Значная большасць беларускіх грамадзян, якія падаюць заяўкі на візы, атрымліваюць іх. Так было раней, і так застанецца і цяпер. Супрацоўнікі нашых консульскіх аддзелаў з'яўляюцца прафесійнымі дыпламатамі. Яны будуць прымаць рашэнне, грунтуючыся на пададзенай інфармацыі, будзе гэта ў Маскве, Кіеве або дзесьці яшчэ".*

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Памяць аб ахвярах партызан караецца арыштам

Суд Старых Дарог пакараў на 15 сутак арышту журналіста і выдаўца Віктара Хурсіка, аўтара кнігі "Кроў і попел Дражна", у якой змешчаны сведчанні аб забойстве савецкімі партызанамі мірных жыхароў.

Пасля ўсталявання крыжа "ў памяць ахвяраў злачынстваў савецкіх партызанаў" у вёсцы Дражна Хурсіку тэлефанавалі на працу і дадому, а нядаўна даслалі позву ў суд. Ён параіўся з юрыстамі і паехаў на суд у Старыя Дарогі.

Раней па гэтай справе 15 сутак адсядзеў дэмакратычны актывіст **Вячаслаў Сіўчык**. Крыж быў дэмантаваны па загадзе мясцовых улад.

"19 красавіка ў вёсцы Дражна мы ўсталявалі крыж Еўфрасінні Полацкай у памяць пра 25 беларусаў, закатаваных савецкім партызанскім аддзелам. Гэта былі мірныя жыхары, жанчыны, дзеці. Было спалена 37 хатаў. Ішоў 1943 год. Партызаны іх не проста забілі, яны іх катавалі перад смерцю. Пахавалі на мясцовых могілках, вось побач з імі ўсталявалі і крыж. Там быў надпіс пра трагедыю, які знік ужо праз дзень, а яшчэ праз два дні зруйнавалі і крыж", — распавёў В.Сіўчык.

"Гэтая спроба ўшанаваць памяць ахвяраў партызан ніяк не ўпісваецца ў сучасныя ўяўленні ўладаў аб гісторыі апошняй вайны, таму яны і вырашылі расправіцца і з крыжам, і з тымі, хто яго ставіў, і з аўтарам кнігі",— зазначае гісторык Яўген Анішчанка.

АДУСЮЛЬ

Уладзімір Арлоў прэтэндуе на прэмію

На прэмію "Еўрапейскі паэт свабоды" намінаваны беларускі пісьменнік і паэт Уладзімір Арлоў. Пра гэта паведамляе польская "Gazeta Wyborcza".

Намінанты на новую літаратурную ўзнагароду былі абвешчаны на мінулым тыдні. Сярод іх — прадстаўнікі Кіпра, Сербіі, Славакіі, Славеніі, Швецыі, Францыі. Беларусь прадставіць кніга вершаў Уладзіміра Арлова "Паром праз Ла-Манш".

Узнагароду ў 100 тысяч злотых (каля 30.000 еўра) заснаваў і фундуе горад Гданьск. У ім і абвесцяць імя пераможцы падчас міжнароднага літаратурнага фестывалю ў 2010 годзе.

Беларускія асілкі

Два беларускія асілкі, рэкардсмены нашай краіны па сілавым шматбор'і — Кірыл Шымко і Павел Сарока — у мінулыя выхадныя змагаліся пад Мінскам з савецкім танкам Т-34.

Яны паспрабавалі яго адцягнуць на максімальную адлегласць. У выніку Шымко і Сарока здолелі працягнуць танк ад месца яго стаянкі на 5 метраў 10 сантыметраў.

Нагадаем, раней беларускія асілкі ўжо адзначыліся тым, што цягнулі за сабой цягнік і нават самалёт.

Вельмі спяшаўся дадому, а трапіў пад следства

Паслядоўніка Рамана Менцюка, які ў сакавіку на аўтамабілі тараніў "жывы шчыт" каля Мінска, лавілі праваахоўнікі ў Заслаўскім раёне.

Мужчына, які толькі выйшаў з-за кратаў, вельмі спяшаўся дахаты і вырашыў скрасці аўтамабіль. Пагражаючы нажом, ён забраў машыну ў таксіста. Аднак пацярпелы паведаміў пра напад у міліцыю. Быў уведзены план "Перахоп".

А тым часам злачынца накіраваў машыну на вялізнай хуткасці ў бок сталіцы. Яго пераследаваў патруль Дэпартамента аховы. У выніку мужчына не справіўся з кіраваннем, выехаў на паласу сустрэчнага руху і "зрэзаў" дрэва.

П'яны кіроўца застаўся жывы. Цяпер ён знаходзіцца пад следствам.

ГОРЯЧАЯ ТЕМА

Учителя против Администрации президента

В пятницу 16 мая состоялось очередное и, как было заявлено, последнее заседание специальной комиссии по реформированию средней школы. Проект декрета об отмене 12-летки уже готов и будет отправлен на согласование Александру Лукашенко.

Удивительно, но разработкой новых параметров средней школы не в меньшей степени, чем Министерство образования, занимается именно президентская Администрация. Даже специальную комиссию, которая была создана после памятного апрельского заседания у Александра Лукашенко по поводу целесообразности 12-летнего обучения в средней школе, возглавил не министр образования Александр Радьков, а заместитель главы Администрации президента Анатолий Рубинов. Последний, к слову, и был сторонником жестких реформ школы. Анатолий Рубинов предлагал не просто вернуть 11-летку, но и подогнать ее под образец советской школы: ликвидировать гимназии и лицеи, все школы сделать базовыми, и лишь в некоторых открыть специализированные классы — с углубленным изучением иностранного языка и физико-математического профиля. Все аргументы замглавы президентской администрации сводились к тому, что советское образование было лучшим в том плане, что было систематизировано, что все школьники независимо от места проживания учились по одним программам и были в равных условиях при поступлении в вузы. Второй аргумент: на лишний год учебы тратятся большие бюджетные деньги, в то время как в стране не хватает рабочей силы.

Чиновники из Минобразования выступали против таких кардинальных изменений. Свой голос в защиту нынешних программ подняли и учителя. Ведь один из вариантов предлагал не только причесать под одну гребенку все школы страны, но и сократить количество уроков истории, пения, убрать из школьного расписания такой предмет, как "Отечественная и мировая художественная культура". Невероятно, но педагоги забросали письмами Министерство образования, Администрацию президента и государственные газеты. И, судя по всему, это возымело действие. Настолько, насколько возможно в современной Беларуси. По крайней мере, на стол Александру Лукашенко ляжет проект декрета с учетом мнения педагогов.

Что предлагается?

11-летней школа должна стать уже в следующем году. Если это произойдет, значит, абитуриентская кампания 2009 года станет многочисленной, конкурсы в вузы будут очень высокие. Ведь одновременно выпускниками станут дети, которые окончат школу по системе 11-летнего обучения, и к ним добавятся ученики, которые сейчас занимаются в 10-м классе по программе 12-летки. Последним предстоит за один год осилить программу двух лет. Честно ли это? Да и по какой программе они будут учиться?

Впрочем, по каким учебникам и каким программам будут учиться все школьники, — вопрос открытый. Члены комиссии считают, что трех летних месяцев на корректировку учебных программ будет достаточно. О том, что предлагается конкретно, члены комиссии предпочитают пока умалчивать. Никто из них не осмеливается даже сказать, останется ли в школьной программе такой предмет, как "ОМХК", останется ли предмет "История Беларуси".

Известно лишь, что переход на 11-летнее обучение предлагается осуществить одновременно с переходом на пятидневку. По субботам школьникам 5—9-х классов будут предложены лишь спортивные занятия и воспитательные часы. Старшеклассники в этот день смогут посещать факультативные занятия, на которых будет проходить углубленное изучение того или иного предмета. Причем занятия эти будут не обязательными, а по желанию. Профильное обучение в старших классах отменяется.

По просьбам учителей и родителей пока решено сохранить гимназии и лицеи, а также лицейские классы в общеобразовательных школах.

Помимо этого, вопреки предложениям некоторых деятелей вернуть советскую пятибалльную систему оценки знаний, 11-летняя школа сохранит десятибалльную систему оценок, а поступление в вузы по-прежнему будет проходить в форме централизованного тестирования.

И, наконец, приятная новость. Летние каникулы сохранятся. Продолжительность учебного года определена с 1 сентября до 1 июня.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ВМЕСТО КОММЕНТАРИЯ

Интернет кишит мнениями специалистов по поводу реформы среднего образования, в спешном порядке объявленной в Беларуси. Мы решили предложить лишь некоторые из них, опубликованные на сайте "Завтра твоей страны":

Владимир МАЦКЕВИЧ, методолог:

— Сегодня средняя школа столкнулась с последствиями, которые на самом деле могли быть не только предсказаны. Они были очевидны уже тогда, когда начинался переход на 12-летнее обучение. Нельзя перейти на 12-летнее образование (когда выпускник выходит из школы в 18 или в 19 лет) без реформирования профессионального и вузовского образования, без перехода на профессиональную армию, без согласованной политики в области труда и занятости. Такого рода масштабные реформы не могут проводиться по одной. Это комплексные реформы, к которым требуется соответствующее интеллектуальное проектное обеспечение. Его нет. Вот если бы к этому готовились пять лет, это прошло бы безболезненно. А когда жареный петух клюнул, тогда начинается паника: "Давайте отменим 12-летку!" Но дело в том, что отмена только порождает другие проблемы.

Татьяна ГАЛКО, бывший замминистра образования:

— Сейчас выпускники школ, которых не коснулась эта реформа, приходят в вузы абсолютно неподготовленными. Я это знаю по собственному опыту работы в высшей школе. И преподавателям вузов приходится тратить и время, и государственные деньги на то, чтобы повторять с ними школьные азы. 12-й год обеспечивает преемственность образования. Возвращение к 11-летке — это та экономия, о которой говорят "скупой платит дважды". Это обернется очень большими проблемами для высшей школы и науки.

Собственно, 11—12-е классы задумывались только для тех, кто будет углубленно изучать профильные предметы и потом поступать в вузы на определенную специальность. И я думаю, это была достаточно разумная мера. По крайней мере, она соответствовала мировым тенденциям. Не могут ошибаться все — один Иван в ногу идти, а вся рота нет.

Взять, к примеру, Германию, где школьное образование, как и в Беларуси, бесплатное. В начальных классах дети учатся 4 года (в некоторых случаях 6 лет), дальше они выбирают полную народную или реальную школу, после окончания которой можно поступать в профессиональные училища или сдать экзамены и поступить в гимназию. И только выпускник гимназии, который смог окончить 11—13-е классы, может поступать в вуз. К этому времени и ученик поймет, чего хочет от жизни, и университетам легче с мотивированными студентами.

ИНТЕРЕСНЫЕ ФАКТЫ

Насколько обоснован один из главных аргументов властей против 12 лет обучения — лишние расходы государства?

В интервью корреспонденту "Завтра твоей страны" депутат Палаты представителей Национального собрания Владимир Зданович отметил, что "экономическая причина — не причина".

— Денег у государства достаточно даже для содержания 15-летнего образования, — подчеркнул Владимир Зданович. — Тем более что количество детей за последние 10 лет уменьшилось на 45 тысяч, на 25% уменьшилось количество школ, и учителей стало меньше. При этом ассигнования в образование увеличились на 15—25%.

Между тем первый заместитель главы Администрации президента Анатолий Рубинов насчитал, что еще один год обойдется обществу примерно в 300 млрд рублей: 100 млрд рублей уходит на 12-й год обучения, а 200 млрд — на "исключение 12-классников из продуктивной жизни".

Эксперты "Интерфакса" назвали еще большую общую сумму финансовых потерь — 350 млрд рублей.

Тем временем дотошный директор Довского учебно-педагогического комплекса в своем письме в "Комсомольскую правду" в Белоруссии" подсчитал, что при шестидневной учебной неделе в течение 11-ти лет ученик проходит путь от первого звонка до аттестата за 2244 дня, а при пятидневной неделе за 12 лет этот путь занимает 2040 дней. Итого получилось, что именно 12-летнее обучение дает... 204 дня экономии электроэнергии на пищеблоках и в классах, а также средств, выделяемых на питание школьникам.

Выкладки рядового директора подтверждают и сведения начальника управления общего среднего образования Минобразования Юрия Гладкова о том, что расходы на 12-й год обучения у государства небольшие.

— Двенадцатый год обучения — это тот год, который получился в результате вычеркивания из "шестидневок" одиннадцатилетней школы всех суббот. Что касается экономических цифр, то затраты на 12-й год обучения составляют около 4% от общих расходов на образование. Я считаю, что эти расходы целиком обоснованы и в конце концов они себя оправдают. Нам нужны мобильные, конкурентоспособные люди, а не люди с лопатой, — подчеркнул Юрий Гладков в интервью "Еврорадио".

И не надо говорить, что 11-летка даст на субботах ту же экономию — во-первых, реальная пятидневка будет только у младших школьников.

Александр КОЗУЛИН: «Кто понесет ответственность за выкинутые впустую сотни миллионов долларов, за человеческие судьбы и за 200 000 учителей?»

В Беларуси с подачи Администрации президента инициируется переход с 12-летнего на 11-летнее среднее образование. Как он будет осуществляться, чиновники должны определиться к концу мая, а внедрять новшества начнут уже с 1 сентября. Из обсуждения проблемы на специальном совещании у президента можно сделать вывод, что переход к одиннадцатилетке произойдет уже в следующем году без адаптационного периода. Свое видение создавшейся ситуации в системе образования излагает бывший ректор Белгосуниверситета, профессор Александр Козулин.

Время в системе образования играет значительную роль. Поэтому то, что было хорошо вчера, часто не соответствует требованиям нового времени. Реформирование системы образования в середине 90-х годов было необходимо. Реформирование было необходимо комплексное, а не отдельных сфер образования.

За годы реформирования было сделано немало. Однако потом начались шаги назад. Сначала свернули практически законченные реформы высшего образования, посчитав, что нам не место в европейском образовательном пространстве. Теперь принято решение о сворачивании реформы среднего образования. А все они (эти реформы) были тесно взаимосвязаны, в том числе дошкольное, профессионально-техническое, среднеспециальное.

Нужно подчеркнуть, что обучение на бакалавра (4 года после окончания школы) — это полноценное высшее образование. Заблуждаются те, кто думает, что двенадцатилетнее образование — это увеличение среднего образования на 1 год.

На проведение реформ нам потребовалось 10 лет. Были затрачены огромные человеческие и материальные ресурсы. Если бы не грубое, невежественное приказное вмешательство, то мы бы сегодня имели современную образовательную систему, отвечающую новым требованиям. Но... сегодня мы вернулись в прошлое. К сожалению, жить в прошлом — характерная черта нынешней власти.

Что бы мы уже имели при завершении реформы?

1. Широкую возможность выбора для творческого развития личности и индивидуализации образования: 12 лет среднего образования + 4 года бакалавра + 2 года магистратуры позволили бы существенно развить всю систему образования, дать ей качественное ускорение.

2. Учитывались бы индивидуальные особенности личности, и давалась бы возможность адаптации с системой международного образования, в первую очередь с европейской.

Но мы, как всегда, пошли по собственному пути развития и загнали себя в местечковый характер образования.

Хотелось бы знать: "Кто понесет ответственность за выкинутые впустую сотни миллионов долларов, за человеческие судьбы и за 200.000 учителей, в перспективе оставшихся без работы?"

Александр КОЗУЛИН, колония "Витьба-3".

МЕРКАВАННЕ

Адчапіцеся вы ад школы!

Дэпутат Уладзімір Здановіч далучыў свой голас да абураных галасоў тых бацькоў і дзяцей, якія не згодны з чарговым разваротам школьнай рэформы да адзінаццацігодкі.

Старшыня парламенцкай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Здановіч лічыць, што сёння прапаноўваецца контрпрадукцыйны варыянт школьнай рэформы. Такую думку ён выказаў у інтэрв'ю БелаПАН. Паводле яго інфармацыі, ужо падрыхтаваны праект дэкрэта, у якім прапаноўваецца школе з 1 верасня працаваць па-новаму. Дэпутат падкрэсліў, што "гэты пераход рыхтуецца ў вельмі вялікай спешцы". "Яе дапускаць нельга. Трэба даць магчымасць цяперашнім дзевятым і дзесятым класам завяршыць навучанне па 12-гадовай праграме", — лічыць ён. У.Здановіч упэўнены, што за два гады падрыхтавацца да пераходу можна "вельмі сур'ёзна, прадумаць усе яго варыянты, паказаць усе негатыўныя і пазітыўныя моманты як спецыялістам, так і грамадству ў цэлым".

Паводле яго слоў, пры пераходзе на 11-гадовую адукацыю адным з варыянтаў рэформы ў школе адначасова прапаноўваецца зменшыць колькасць урокаў "да бязмежна нізкай колькасці". "На аднаго вучня будзе прыпадаць менш за 800 урокаў у год. Для параўнання: у Кітаі — 1500 пры 12-гадовым навучанні ў школе. Гэта прывядзе да таго, што вучням давядзецца дома самім без настаўнікаў прапрацоўваць тыя ж самыя тэмы, праграмы. Навучальная нагрузка перанясецца са школы дадому", — сказаў дэпутат.

Апрача таго, лічыць ён, рэформа прывядзе да скарачэння настаўнікаў у школах. "Па-першае, скарачаюцца навучальныя гадзіны, па-другое, субота становіцца свабоднай. Так, ёсць прапанова зменшыць колькасць гадзін на стаўку, але некаторыя прадметы поўнасцю ліквідуюць. Калі гэта адбудзецца, то разам з прадметам школу пакінуць і настаўнікі сусветнай мастацкай культуры, асноў бяспекі жыццядзейнасці і іншых дысцыплін. Увогуле ж, скарачэнні закранаюць фактычна ўсе прадметы, у тым ліку матэматыку, фізіку, біялогію", — зазначыў У.Здановіч.

Дэпутат негатыўна ставіцца і да поўнай ліквідацыі вывучэння асобных прадметаў на павышаным і паглыбленым узроўнях. "Калі прымецца варыянт Міністэрства адукацыі, то мы ўсіх падстрыжом пад адзін грэбень: хто слаба вучыцца, хто моцна, будуць вучыцца па аднолькавых праграмах. Факультатывы, якія плануецца праводзіць у суботні час, не выратуюць становішча", — лічыць ён.

"Калі рэформа будзе праведзена ў такім выглядзе, то праз некаторы час нашы дзеці і ўнукі будуць працаваць на кітайскіх прадпрыемствах, размешчаных на тэрыторыі Беларусі, а кіраваць прадпрыемствам будуць кітайцы. Узровень адукаванасці беларусаў і кітайцаў будзе адрозніваца, прычым далёка не на нашу карысць", — дадаў У.Здановіч.

Ён таксама лічыць, што ад паспешлівага пераходу на 11-гадовую школьную адукацыю "істотна пацерпяць вучні некалькіх узростаў". Напрыклад, вучні 9-10-х класаў. Па-першае, яны за адзін год будуць праходзіць праграму двухгадовай падрыхтоўкі. Па-другое, навучанне "будзе весціся скомкана, таму што няма сур'ёзных прапрацовак ні ў праграмах, ні ў тэмах, ні ў падручніках".

Вельмі адмоўна У.Здановіч ставіцца і "да моцнага прадаўжэння навучальнага года на летні перыяд". "Ініцыятары не задумваюцца аб наступствах прадаўжэння. Мала таго, давядзецца мяняць указ прэзідэнта аб правілах паступлення ў ВНУ, бо змяшчаюцца тэрміны. Практычна адначасова ў школе будуць праходзіць навучальныя заняткі, малодшыя класы будуць знаходзіцца пры школе ў дзіцячым аздараўленчым лагеры, школа будзе рыхтавацца да новага навучальнага года, для некаторых класаў будуць праводзіцца выпускныя экзамены. І ўсю гэтую работу будуць выконваць адны і тыя ж настаўнікі, перагрузка якіх у гэты час будзе каласальнай", — зазначыў дэпутат.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 МАЯ 2008 г.

Правительство сдалось под напором инфляции

Планы белорусского правительства удержать инфляцию в рамках прогнозных 8 процентов (а это верхняя планка), похоже, так и останутся в планах. Уже по итогам первого полугодия инфляция может составить 6,5—7,5%.

Такое мнение высказал глава Нацбанка Беларуси Петр Прокопович. *"Что будет дальше — посмотрим. В третьем квартале, как правило, цены растут менее высокими темпами"*, — отметил он на пресс-конференции в Минске.

Только в январе-апреле текущего года инфляция составила 5,3% (в том числе цены на продовольственные товары выросли на 5,1%) против 2,8% за аналогичный период прошлого года. По словам главы Нацбанка, инфляция в нашей стране обусловлена в основном влиянием внешних факторов: *"Здесь нет монетарных факторов"*.

Петр Прокопович считает, что по итогам года инфляция в Беларуси будет ниже по сравнению с ее годовым значением, которое сформируется при условии сохранения текущего уровня среднемесячной инфляции. Так, при среднемесячной инфляции 1,3%, которая сформировалась за 4 месяца, уровень инфляции составит 15,6% за год. *"Это запредельный уровень, по итогам года инфляция будет меньше"*, — цитирует Прокоповича "Интерфакс".

О том, что правительство не сумеет удержать инфляцию на прогнозном уровне, премьер-министр Сергей Сидорский доложил президенту. Невыполнение одной из важнейших финансово-экономических задач глава правительства также объяснил негативным влиянием внешних факторов.

Высокий уровень инфляции может подтолкнуть Нацбанк к непопулярным решениям, в частности, к необходимости повысить ставку рефинансирования. Такой шаг Петр Прокопович не исключает, если в последующем среднемесячный уровень инфляции превысит 1%. *"Если инфляция в дальнейшем составит менее 1% в среднем за месяц, то необходимости в повышении ставки рефинансирования не будет"*, — сказал глава Нацбанка.

Вместе с тем Петр Прокопович полагает, что рост инфляционных процессов может быть компенсирован опережающим ростом заработной платы. *"Рост заработной платы сейчас является главным. Эти факторы в наших руках, и мы должны приложить усилия, чтобы выполнить и перевыполнить прогнозы по росту реальной зарплаты"*, — подчеркнул Прокопович и выразил уверенность, что *"темпы роста заработной платы будут увеличиваться — для этого есть все возможности: повышается производительность труда, растет экспорт"*.

Как доложил Сергей Сидорский президенту страны, проект бюджета на 2009—2010 годы формируется, исходя из поручения главы государства довести к 2010 году среднюю заработную плату до 700 долларов в эквиваленте. Для достижения этой высоты, по мнению главы правительства, уже в 2009 году необходимо обеспечить зарплату на уровне 600 долларов. Сегодня средняя заработная плата составляет 435 долларов.

Дмитрий СЕРГЕЙЧИК.
"Белорусские новости".

Усё на продаж!

Да канца года "Белнафтахім" плануе ўнесці ва ўрад прапановы па прыватызацыі такіх буйных прадпрыемстваў, як "Палімір" і "Нафтан". Пра гэта паведаміў намеснік старшыні канцэрна Міхаіл Асіпенка на прэс-канферэнцыі ў Мінску. Па яго словах, разглядаецца варыянт продажу "Паліміра" і "Нафтана" адзіным гаспадарчым комплексам.

Продлили льготы инвесторам в сельское хозяйство

Продлен срок действия некоторых льгот инвесторам в сельское хозяйство Беларуси. Соответствующий указ подписал президент Беларуси 13 мая, сообщили БЕЛТА в пресс-службе главы государства.

В соответствии с указом №258 "О некоторых мерах по повышению эффективности сельскохозяйственного производства" организациям-инвесторам, приобретшим в 2004—2005 годах, согласно указу от 19 марта 2004 года №138, убыточные сельхозорганизации, предоставляются льготы на 3 года (2008—2010) по платежам в бюджет по определенным сборам и налогам на сумму приобретенных сельхозтехники, оборудования и запчастей к ним.

Кроме того, учредителям (участникам) юридических лиц в случае приобретения и передачи этим юрлицам такой техники и запчастей к ней в течение двух лет с даты передачи предоставляются льготы по уплате налога на прибыль.

Эти нормы продлевают срок действия льгот, установленных указом от 19 марта 2004 года №138, в соответствии с которым организациям-инвесторам было дано право в течение 2005—2007 годов приобретать технику и запчасти к ней на сумму, эквивалентную 150 тыс. евро, с уменьшением общего размера платежей в бюджет. Аналогичная норма установлена и для учредителей (участников) юридических лиц.

Указом также регулируются вопросы расчетов организаций-инвесторов за приобретенные в 2004—2005 годах имущественные комплексы убыточных сельхозорганизаций.

Чаму беларусы жыць не хочуць?

635 беларусаў скончылі жыццё самагубствам у першым квартале бягучага года. Такую лічбу назвала Міністэрства статыстыкі і аналізу.

Атрымліваецца, што кожны дзень з жыцця сыходзілі ў сярэднім сем чалавек. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць самазабойцаў у Беларусі павялічылася амаль на 9%.

Васілевіч не дапамог

Каля паўсотні чалавек з нефармальнага аб'яднання ў абарону грамадзянскіх правоў заявілі пра неабходнасць стварэння грамадскай камісіі дзеля перагляду крымінальных спраў. На сустрэчу з журналістамі прыйшлі жанчыны, якія лічаць, што іх блізкіх (альбо іх саміх) несправядліва асудзілі.

"Сумеснымі намаганнямі гэтая група пачала дзейнічаць з лютага гэтага года, — паведаміла юрыст Тамара Сяргей. — А сфарміравалі гэтую групу супрацоўнікі пракуратуры і судоў. Я гэта магу сказаць з усёй адказнасцю. Бо людзі дабіваюцца справядлівага перагляду спраў, а іх ніхто не чуе. Ідуць звычайныя адпіскі. Жанчыны спадзяваліся, што з прыходам на новую пасаду генпракурора Рыгора Васілевіча нешта зменіцца, але куды там. Смешна казаць, але тыя адпіскі, якія людзі атрымлівалі ад іншых людзей з Генпракуратуры, зараз слова ў слова атрымліваюць і за подпісам Рыгора Васілевіча".

Хлопчыка знайшлі ў... халадзільніку

Вучня 3-га класа, які знік у Шумілінскім раёне, міліцыя і выратавальнікі шукалі на працягу шасці дзён. А знайшлі ў старой лядоўні ў разбураным доме ў яго роднай вёсцы. Паведамляецца, што разбураны дом знаходзіцца ў 10-ці метрах ад дома, дзе жыве сям'я хлопчыка.

Цяпер пракуратура вядзе расследаванне.

Паводле папярэдняй версіі, школьнік залез у старую халадзільную камеру, дзверы закрыліся, а адкрыць іх можна было толькі звонку. Смерць хлопчыка наступіла ў выніку пераахаладжвання.

ЭКСПЕРТЫЗА

Долар падае, а як утрымацца беларускаму рублю?

Уладзімір КУЛАЖАНКА,
доктар эканамічных навук, прафесар

Перш чым пачаць аналіз валютнага крызісу ў свеце, звязанага з крызісам долара ЗША, згадаем, што такое валютны курс і ў чым яго істотная важнасць у сучасных умовах. Змест гэтага курса ў тым, што адна валюта прыраўноўваецца да іншай на аснове пакупніцкай здольнасці ўнутры краіны. Калі мы заяўляем, што курс беларускага рубля сёння на ўзроўні 2150 рублёў за 1 долар, то такім чынам сведчым, што за гэтыя дзве тысячы рублёў можам купіць столькі тавараў у Беларусі, колькі амерыканец купіць у Амерыцы за 1 долар.

Але сказанае яшчэ не дае адказу на пытанне: чаму павінен вызначацца валютны курс? Ён просты: існуе сусветны падзел працы і гандаль. Беларусь сёння наладзіла і падтрымлівае эканамічныя сувязі з усімі катынентамі свету, з дзесяткамі краін. Таму, калі мы прадаём свае тавары краінам Афрыкі ці Азіі, то не можам устанаўліваць цану ў сваіх ці расійскіх рублях. Узнікае патрэба прадаваць свае тавары па цане, выяўленай у вядомай валюце. Такіх валют не надта і шмат. Гэта долар ЗША, еўра, фунт стэрлінгаў, японская іена і яшчэ некалькі.

Яшчэ адна вельмі важная акалічнасць тлумачыць, чаму валютны курс усіх краін вымяраецца ў валюце моцнай краіны. Як вядома, раней ролю грошай выконвалі ў асноўным золата і срэбра, і велічыня цаны тавара вызначалася вагой нейкай колькасці золата пэўнай пробы. Усе, хто гандляваў, "прывязваліся" да золата. Інфляцыі не было месца, апроч выпадкаў, калі павышалася выдайнасць працы ў здабычы золата, і тады за адзін і той жа тавар трэба было даваць больш гэтага металу. Цэны павышаліся. Быў такі выпадак: прыкладна тры з паловай стагоддзі таму ў Вялікабрытаніі раптам рэзка ўзраслі цэны. Ніхто не ведаў, чаму. Грамадства было ў разгубленасці, пакуль таленавіты эканаміст Уільям Пеці, якога К.Маркс называў бацькам палітычнай эканоміі, не патлумачыў, што цэны выраслі таму, што ў выніку павышэння прадукцыйнасці працы ў золатаздабычы золата патаннела і зараз за адзін і той жа тавар пры эквівалентным абмене трэба даваць каштоўнага металу больш.

Зараз сітуацыя ў свеце змянілася. У абарачэнні не золата, а папяровыя грошы. Іх курс гарантуецца не толькі золатам як прадуктам працы высокай вартасці, а багаццем краіны, наяўнасцю выраблена прадукцыі. Але золата і срэбра напамінаюць пра сябе як надзейныя сродкі накаплення. Многія банкі свету, у тым ліку і наш Нацыянальны банк, падчас крызісу папяровых грошай сталі купляць золата і папаўняць ім свае рэзервовыя і стабілізацыйныя фонды. Не выпадкова цана адной тройскай унцыі золата ўзляцела сёння да 1000 долараў, вагаецца, але прадаўжае расці.

Канешне, каб можна было зноў увесці залатое грашовае абарачэнне, то знікла б інфляцыя і не было б крызісаў грашовага абарачэння. Усё вызначалася б вартасцю і цаной золата. Але гэтаму перашкаджаюць дзве прычыны: па-першае, трэба надта многа золата, частка якога ў сферы абарачэння па прычыне зносу проста знікала б. Па-другое, на гэта не пагодзяцца ўладныя структуры, бо пры гэтым яны згубілі б усялякую магчымасць уплываць на эканоміку.

Зараз у свеце вялікі валютны крызіс, які зыходзіць з прычыны рэцэсіі эканомікі ЗША. А яшчэ нядаўна ў друку і грамадстве падтрымлівалася рашэнне ўлад Беларусі аб пераарыентацыі прывязкі да расійскага рубля і пераход гэтай прывязкі да амерыканскага долара. Выказваліся розныя меркаванні адносна прычыны гэтага пераходу, яго эканамічным змесце; хто выйграе, хто прайграе, што будзе з курсам рубля ў перспектыве.

Змена вектара валютнага курса беларускага рубля звязана з тым, што доля таваразвароту з Расіяй паступова скарачаецца, а з краінамі так званага далёкага замежжа расце. Для прастаты разлікаў і вызначэння цэн доларавая ацэнка неабходная. Але зараз на першы план выступае праблема, як правільна вызначыць валютны курс рубля ды эканамічна абгрунтавана падтрымліваць гэты курс. Тым болей што валютныя курсы вялікіх краін вагаюцца, і пры дапушчэнні памылкі ў гэтай справе можна прайграць.

Прыкладам можа быць вызначэнне валютнага курса долара. Так, летась на пачатку года рэзка павысіўся курс еўра ў адносінах да долара. Спачатку ў Еўропе пляскалі ў далоні, а потым агледзеліся, што гэта небяспечна для Еўропы, бо пагоршыліся ўмовы знешняга гандлю для яе краін. Так, пры экспарце тавараў з Еўропы ў ЗША і рэалізацыі іх па цэнах у доларах аказалася, што пры перараздзіле іх у еўра еўрапейскія таваравытворцы сталі несці страты. Аглянуліся фінансісты і сталі папраўляць сітуацыю. Навучаныя вопытам еўрапейцаў, асцярожнічаюць пры вызначэнні валютнага курса і ў Беларусі. Можна толькі адобрыць дзейнасць Нацыянальнага банка Беларусі, дзе не спяшаюцца павышаць курс беларускага рубля да долара. Справа ў тым, што ў сённяшніх умовах у Еўропе і ў Азіі пачынаюць разумець, што зніжэнне курса долара выгадна ЗША, а не Еўропе ці Расіі. Фактычна краіны-долартрымальнікі плацяць ЗША своеасаблівую даніну. Апроч гэтага, пачынаюць губляць даходы ад экспарту сваіх тавараў. У Еўропе толькі аб'явілі аб дасягненні краінамі Еўрасаюза ўзроўню вытворчасці ЗША, дзе вырабляецца 29% ВУП свету, а за кошт актыўнага плацежнага балансу спажываецца 40%. Рэцэсія ў ЗША можа знізіць долю спажывання, што таксама можа нанесці шкоду ў гандлі з ЗША. Дарэчы, Расія вырабляе ВУП ў 10 разоў меней за ЗША, усяго каля 3% ад сусветнага аб'ёму.

У сувязі з вышэйадзначаным у Еўропе і Азіі прымаюцца меры па стабілізацыі эканомікі ЗША, рэцэсіі вытворчасці, хоць яна і невялікая. Невыпадкова міністр фінансаў Японіі Фукусіра Нукага заявіў, што неабходна ўмяшанне манетарных улад. Ён зазначыў: "Неабходна правесці перамовы з Еўрапейскім цэнтрабанкам і ФРС Злучаных Штатаў, абмеркаваць тое, што адбываецца на сусветным валютным рынку, і прыняць меры для таго, каб спыніць далейшае падзенне нацыянальнай валюты ЗША".

З улікам адзначаных умоў і акалічнасцяў беларускі рубель не можа арыентавацца на Расію і яе грошы. Расія — краіна, якая развіваецца дзякуючы валютным паступленням за газ і нафту, мае шмат нявырашаных праблем. Узяць аграрную. Краіна, дзе "многа ў ёй лясоў, палёў і рэк", завозіць 60% спажываемых прадуктаў харчавання. Або такі факт: у Расіі за час кіравання У. Пуціна даўжыня пакрытых дарог скарацілася на 50 тыс. км і складае сёння ўсяго 700 тыс. км. Які гэта мізер, відаць з таго, што такую ж працягласць пакрытых дарог (цяжка паверыць!) мае менавіта Фінляндыя. А Японія — у 2 разы большую, Францыя — у 1,6 раза (хоць тэрыторыя ў гэтых краінах у разы меншая), а ЗША — у 10 разоў. Замест мабілізацыі грашовых рэсурсаў на будаўніцтва дарог Расія пасля развалу СССР даравала даўгі многім краінам свету на суму болей за 75 млрд долараў. У тым ліку Іраку — 12 млрд долараў, Манголіі — 11, Сірыі — 9,8 млрд і г.д. Між іншым, у гэтай дараванай суме ёсць і валюта, якая належыць беларускаму народу.

Аднак незалежна ад таго, да якой сусветнай валюты будзе прывязаны беларускі рубель, на сёння галоўнай задачай фінансавых органаў рэспублікі з'яўляецца ўстанаўленне такога аптымальнага валютнага курса рубля, каб не губляць пры экспарце тавараў за межы краіны, не дапусціць узмацнення інфляцыі і забяспечыць рост жыццёвага ўзроўню ўсіх груп насельніцтва.

Справіцца з гэтымі задачамі не проста. Звернемся да барацьбы з інфляцыяй. Добра, што нам на сёння не пагражае іпатэка. Калі ўзяць ЗША, адкуль зыходзіць пагроза інфляцыі і валютнага крызісу, то там іпатэка дасягнула 70% ВУП, у Вялікабрытаніі — 45%, у Еўропе ў сярэднім — 40%, а ў Беларусі — толькі 2—3%. Але, з другога боку, нізкі ўзровень іпатэкі азначае слабае выкарыстанне крэдыту для інвестыцый, росту вытворчасці.

Аднак галоўнай прычынай актывізавання інфляцыі з'яўляецца рост цэн на энерганосьбіты і на прадукты харчавання. Тут ад Беларусі мала што залежыць. Менавіта па гэтай прычыне інфляцыя ў Беларусі дасягнула летась 12,1%. Высокі старт інфляцыі ўзяты і ў гэтым годзе. У студзені яна склала 2%.

Не бачыцца магчымым зніжэнне цэн і на прадукты харчавання. Прычына ў тым, што ў многіх краінах свету (Індыя, Кітай, Бразілія) вырас сярэдні клас, які прад'явіў попыт на якасныя прадукты харчавання. І гэты попыт прадаўжае расці. А там, дзе расце попыт, апераджаючы прапанову, непазбежны рост цэн. Беларусь пакуль не можа выкарыстаць спрыяльную кан'юнктуру на сусветным харчовым рынку. Заклікі прэзідэнта А. Лукашэнкі да гэтага застаюцца без адказу. І не без падстаў.

Усё болей робіцца відавочным, што справіцца з ростам інфляцыі, забяспечыць прымальны валютны курс рубля можна толькі шляхам паскарэння развіцця эканомікі, павелічэння экспартнага патэнцыялу і фарміравання стабілізацыйнага фонду не за кошт знешніх крэдытаў, а за кошт даходаў па актыўным гандлёвым і плацёжным балансе. Няма чаго хваліцца, што перад новым годам стабілізацыйны фонд складаў 3 млрд долараў — і вось, калі быў атрыманы вялікі крэдыт ад Расіі, раптам дасягнуў 5 млрд долараў...

Каб папаўняўся стабілізацыйны фонд, які мае вялікі ўплыў на надзейны валютны курс рубля, устойлівасць цэн на ўнутраным рынку, трэба ўсяляк нарошчваць экспарт тавараў, каб ён перавышаў імпарт, што і ёсць галоўная ўмова папаўнення валютных запасаў краіны. Між тым летась экспарт беларускіх тавараў адставаў ад тэмпаў росту імпарту на 5%. У выніку адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі скала 4,3 млрд долараў. Гэты мінус у параўнанні з папярэднім годам павялічыўся аж на 1,7 млрд долараў! Без выпраўлення такой трывожнай сітуацыі нельга ісці наперад у развіцці эканомікі. Прычым прырост экспартуемай прадукцыі адбываецца вельмі нераўнамерна ў галіновым разрэзе. Так, прырост экспарту нафтапрадуктаў (праўда, вырабленых з імпартнай сыравіны), удзельная вага якіх у экспарце дасягае 31%, летась з улікам росту цэн дасягнуў 957 млн долараў. Нарасцілі экспарт трактарная прамысловасць разам з вытворчасцю сядзельных цягачоў на 413 млн долараў, ды вытворчасць калійных угнаенняў, зноў жа з улікам росту цэн — на 337 млн долараў. Астатнія галіны далі нязначны прырост. Не дапамог і рост цэн. Вытворчасць грузавых аўтамабіляў дала магчымасць прырасціць экспарт толькі на 242 млн долараў, а сельскагаспадарчай прадукцыі прададзена па асобных відах толькі крыху болей за 100 млн долараў.

З усяго сказанага вынікае, што, каб забяспечыць пераадоленне інфляцыі і яе папярэджанне, устойлівасць валютнага курса рубля і яго ўплыў на стабілізацыю эканомікі і рост жыццёвага ўзроўню, трэба выкарыстаць усе фактары эканамічнага росту. Асаблівая ўвага перш за ўсё зніжэнню энергаёмістасці ўсіх відаў прадукцыі і павышэнню навукаёмістасці. Якраз па гэтых паказчыках Беларусь у разы адстае ад развітых краін. Калі на 1000 долараў ВУП мы затрачваем энергіі ў нафтавым эквіваленце 45 кг, то ў Германіі — толькі 17 кг. Нават у Польшчы значна меней — 34 кг. Толькі перад Расіяй мы выглядаем лепей. Там аналагічны паказчык дасягае аж 70 кг. Але ў Расіі ўласнага паліва і энергіі хоць гаць гаці. (Праўда, гэта сведчыць аб тэхналагічнай і тэхнічнай адсталасці Расіі.) Гэтая краіна не можа быць для нас узорам у справе энергазберажэння.

Што датычыцца навукаёмістасці беларускай прамысловай прадукцыі, то яна складае толькі 7% ад ВУП. Значыць, трэба энергічна нарошчваць інвестыцыйны працэс на інавацыйнай аснове. Але дзе ўзяць грошы? На думку намесніка міністра энергетыкі Л.Шэнеца, толькі ў энергетыку да 2020 года нам трэба ўкласці 19 млрд долараў, ды ў энергазберажэнне (фактычна ў новыя тэхналогіі) 12,5 мільярда.

Выйсце адно: каб прадпрыемствы мелі сродкі для інвестыцый, трэба пераадолець такую акалічнасць, як празмерныя падаткі і зборы. Гэта не жарт, калі праз падаткі і зборы ў Беларусі акумулюецца 50% ВУП. Калі сур'ёзна гаварыць аб інавацыйным працэсе, то ўзровень падаткаабкладання трэба знізіць да 30 %, а можа, і ўдвая. Адпаведна павінны быць перагледжаны прынцыпы размеркавання бюджэтных сродкаў. Ва ўмовах росту цэн на энерганосьбіты, прычым у разы, без такіх мер нам цяжка будзе вырашаць праблемы эканамічнага росту, эканамічнай стабілізацыі краіны, папярэджання інфляцыі на аснове трываласці валютнага курса рубля.

Другім прынцыпова важным фактарам з'яўляецца вырашэнне аграрнай праблемы. Паколькі тут не праведзены рэформы, сельская гаспадарка адцягвае вялікія сродкі з эканомікі краіны, а выніку — ніякага. Летась прырост вытворчасці склаў толькі 3 %. Але і гэты мізэрны прырост быў неэфектыўным. Як адзначыў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Папкоў нядаўна на пасяджэнні Савета міністраў, "мы сёння вырабляем 70% (!) стратнай прадукцыі ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі. Мы заходзім у тупік". І выйсце з гэтага тупіка не гарантуе тое, што, паводле афіцыйных даных Міністэрства фінансаў, сёлета з бюджэту для падтрымкі АПК будзе выдадзена 9,5 трлн рублёў. Што гэта за сума, сведчыць тое, што ўся выручка ад рэалізацыі сельгаспрадукцыі летась склала меншую велічыню — 6,5 трлн рублёў. Канешне, аказваць дапамогу сельскай гаспадарцы — ёсць еўрапейская практыка. Але не ў такіх памерах. У нас жа датацыі ідуць не непасрэдным вытворцам, а пасрэднікам. Ды арганізацыйныя формы сельгаспрадпрыемстваў не адпавядаюць патрабаванням рынку. Таму і заходзім у тупік. У выніку — рост цэн на малако, мяса і іншую сельскагаспадарчую прадукцыю, нават на бульбу і хлеб.

Аб якой харчовай бяспецы і таваранасці сельгасвытворчасці можа ісці гаворка, калі не дасягнуты ўзровень вытворчасці 1990 года? Тады было 6975 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, зараз — крыху больш за 4 мільёны, кароў — меней на 700 тыс. галоў. Не дасягнуты ўзровень збору збожжа; бульбы летась сабрана на 500 тыс. тон меней, чым у 1990 г. Нягледзячы на скарачэнне насельніцтва, зменшылася вытворчасць прадукцыі ў разліку на чалавека. Напрыклад, мяса — на 45 кг, малака — на 150 кг. Сельскую гаспадарку пакідае працаздольнае насельніцтва. Калі ў гэтай галіне ў 1990 годзе працавала 985,4 тыс. чалавек, то зараз — толькі 400 тысяч. І гэта ва ўмовах, калі рэзка зменшылася колькасць тэхнікі: трактароў, камбайнаў, грузавікоў ды іншай.

У сённяшняй сітуацыі выйсце бачыцца ў глыбокай аграрнай рэформе, якая была праведзена ў Польшчы, Германіі, Літве ды іншых краінах Еўропы. Трэба рэзка павялічыць колькасць фермерскіх гаспадарак і стварыць усе ўмовы для іх развіцця. Недапушчальна, што з 1995 года колькасць фермерскіх гаспадарак скарацілася дзесьці на 1000 адзінак і складае сёння ўсяго каля 2000 гаспадарак. Аб'ём жа вытворчасці ў гэтым сектары расце і дасягае сёння 2,5% усіх відаў сельгаспрадукцыі рэспублікі і паказвае яго перспектыўнасць.

Аднак фермерызацыя сельскай гаспадаркі ў краіне павінна весціся, з аднаго боку, з улікам еўрапейскага вопыту, напрыклад, германскай зямельнай рэформы, калі праводзілася ўзбуйненне дробных гаспадарак, але і з улікам нашай сітуацыі. Напрыклад, немэтазгодна ліквідоўваць тыя буйныя калгасы і саўгасы, якія ўліліся ў рынак, і з'яўляюцца рэнтабельнымі, а людзі маюць добрыя заробкі.

Імкнучыся выйсці з аграрнага крызісу, беларускія ўлады прыступілі да стварэння аграгарадкоў. Справа, лічу, добрая ў тым плане, што павышае сацыяльны статус вёскі. Але для вырашэння аграрных праблем гэта нічога не дасць. Чаму? Проста таму, што гэта палітыка згону сялян з зямлі. Калі жыхары вёсак вакол гарадкоў не будуць мець ні школ, ні клубаў, ні магазінаў, ні медпунктаў, то ўсе маладыя сем'і пабягуць з гэтых вёсак і часцей за ўсё міма аграгарадкоў, а прама ў гарады і мястэчкі. І галоўнай прычынай ёсць тое, што будуюцца на вёсцы не сялянскія сядзібы, а кватэры, не ствараюцца рабочыя месцы з такімі заробкамі, каб маладыя сем'і маглі гадаваць дзяцей і нармальна спажываць прадукты харчавання з магазінаў, калі там яны будуць. Словам, будаўніцтва аграгарадкоў наўрад ці спыніць адток насельніцтва з вёсак, які працягваецца і зараз. Калі ў 1990 годзе ў вёсцы пражывала 19,1% усяго насельніцтва краіны, то зараз — толькі 10%. Чакаецца, што ў бліжэйшыя гады можа стаць яшчэ меней.

Як бачым, праблем на вёсцы шмат. І калі яны не будуць вырашацца, то нельга будзе забяспечыць эфектыўны інвестыцыйны працэс, рост вытворчасці, трываласць рубля, не дапусціць абвальнай інфляцыі.

Па-трэцяе, не меншае значэнне для росту вытворчасці, стабілізацыі сацыяльна-эканамічных аспектаў грамадскай вытворчасці, пераадолення, а лепей папярэджання фінансавага і валютнага крызісу шляхам надзейнасці пакупніцкай здольнасці рубля мае развіццё ў краіне прадпрымальніцкай дзейнасці. Усім аб'ектыўным эканамістам і камандзірам вытворчасці вядома, што дробныя і сярэднія прадпрымальнікі ва ўсіх развітых краінах свету з'яўляюцца рухаючай сілай навукова-тэхнічнага прагрэсу і маюць значную ўдзельную вагу ў вытворчасці ВУП. Напрыклад, у ЗША дробны і сярэдні бізнес дае болей палавіны ВУП, ён дасягае 17 трыльёнаў долараў. У гэтай краіне кожны год спрабуюць пачаць сваю справу, стаць прадпрымальнікамі каля 900 тысяч маладых людзей. Яны імкнуцца замацавацца ў бізнесе шляхам укаранення новых тэхналогій, новых відаў прадукцыі ці паслуг, дасягненняў навукі. Жорсткую канкурэнцыю вытрымліваюць толькі 10% пачынаючых. Але на наступны год, рухаючы тэхнічны прагрэс, зноў імкнуцца заняцца прадпрымальніцтвам 900 тысяч чалавек! Усё гэта выступае творчым механізмам і прыносіць вялікую карысць дзяржаве і народу.

А як справы ідуць у нас? На вялікі жаль, прадпрымальніцкі сектар доўгі час не мае належнай падтрымкі. Чаго варты толькі апошні ўказ прэзідэнта аб пераводзе індывідуальных прадпрымальнікаў у прыватныя прадпрыемствы! Ці забарона індывідуальным прадпрымальнікам выкарыстоўваць рабочую сілу апроч блізкіх сваякоў. І як здзіўляцца пасля гэтага, што доля малых прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў у вытворчасці ВУП не дасягае ў нас і 9%? Іншая справа, каб яго ўдзельная вага дасягала хоць бы 25—30% ВУП. Для паскарэння ж тэмпаў эканамічнага развіцця краіны і дасягнення яе стабільнага становішча на фінансавым рынку неабходна карэнным чынам змяніць адносіны да дробнага бізнесу з боку дзяржавы, падтрымліваць яго ў такой жа меры, як і дзяржаўны сектар. Інакш не справіцца з пераадоленнем рэальнага беспрацоўя, якое дасягае сёння болей за 7% і дае асабліва пра сябе знаць у гарадскіх пасёлках і малых гарадах. З улікам ролі малога бізнесу проста незразумела, чаму адміністрацыйныя структуры не даюць яму ходу. Ствараецца ўражанне, што яны баяцца росту сярэдняга класа, які з'яўляецца асновай дэмакратычнага ладу.

Каб распрыгоніць прадпрымальніцкі сектар, трэба многае зрабіць. Змяніць адносіны чыноўнікаў да бізнесу, наладзіць адпаведную працу мясцовых органаў улады па стварэнні ўмоў гаспадарчай дзейнасці. Удасканаліць заканадаўства Рэспублікі Беларусь, якое рэгулюе дзейнасць суб'ектаў гаспадарання. А праблемы ў будаўніцтве вытворчых памяшканняў? Як можна пачынаць і пашыраць сваю справу, калі цэны на зямлю за апошнія два гады ўзляцелі да нябёсаў? Рашэннямі ўлад цана толькі аднаго квадратнага метра пад вытворча-складскую забудову дасягнула 68,2 долара. Няцяжка ўявіць, як паўплывае гэта на развіццё бізнесу. Такая ж перашкода стаіць перад прадпрымальнікамі пры арэндзе памяшканняў.

Пералік перашкод эканамічнаму росту можна доўжыць. Але і прыведзеныя фактары даюць уяўленне аб тым, што трэба зрабіць, каб пазбегнуць інфляцыі, умацаваць курс рубля, максімальна аслабіць уплыў крызісу фондавага рынку ў Амерыцы, Азіі і Еўропе, падзення курса долара.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 МАЯ 2008 г.

Спасибо за правдивую информацию!

Глубокоуважаемый Иосиф Павлович и сотрудники редакции "Народной воли"!

Я уже третий год выписываю "Народную волю". Благодарю вас всех за правдивую информацию о событиях, происходящих в нашей многострадальной стране.

Благодарю вас всех за мужество, связанное с изданием каждого номера газеты.

Посылаю вашей редакции в ее поддержку 50 тысяч рублей.

София Ивановна МОНАХОВА, ветеран Отечественной войны, кандидат медицинских наук.

ОТ РЕДАКЦИИ

Уважаемая София Ивановна!

Вы благодарите нас, сотрудников редакции, а знали б Вы, как мы признательны Вам, наши дорогие читатели! Получая скромные пенсии, зарплаты, Вы считаете нужным поддержать "Народную волю" в трудный период. Какое же это благородство с Вашей стороны!

Поэтому спасибо, большое спасибо Вам, София Ивановна, крепитесь, дай Вам Бог еще многих лет жизни!

НЕЛЬЗЯ МОЛЧАТЬ!

Счастливые убийцы

Передо мной журнал охотников и рыболовов Беларуси "Удача" (№7, 2008 г.). На обложке крепкий, мордасто-румяный охотник со счастливой зубастой улыбкой — одной рукой он держит убитого волка за лапу, другой — за ухо.

Жертва его удачи, поникший волк с окровавленной мордой, со следами крови на боку, лапе, посажена на снег, в рост, дабы созерцающие фото не усомнились в величине трофея.

В душе нарастает смятение: какой на дворе сегодня век? Что с нами творится, когда смакование вида крови преподносится как большая удача? Во всем мире количество охотников уменьшается, и это расценивается как рост духовности общества, его экологической образованности. Ни один кандидат на пост президента не получит его на Западе, если будет уличен в приверженности охоте. Охота трактуется как порок, атавизм, от которого необходимо избавляться.

Беларусь же открывает себя миру не как страна, лелеющая своих детей природы, ниспосланных Богом в наши леса и луга, а как жестокий варвар, в силу неразвитости души отдающий на откуп убийце-охотнику существ, полных трепетной жизни.

Смотришь рекламу — и берет оторопь: государственная инспекция по охране животного и растительного мира при президенте Республики Беларусь демонстрирует клип с тушей убитого кабана; охотник поглаживает труп по морде еловой лапкой, затем пристраивает "украшение" на шляпу. В это время задушевный голос за кадром объясняет молодому поколению и всему остальному несведущему в тонкостях жертвоприношения населению, что охотник никого не обидит, что его задача — охрана леса! Разнузданная, не имеющая никакой моральной ценности реклама охоты есть не что иное, как пропаганда насилия и убийства. Закрыть глаза на эту вакханалию попрания прав природы сегодня — значит нанести непоправимый урон духовному развитию общества. И никакие храмы с золотыми куполами не помогут нам отмолить грехи наши тяжкие.

Маргарита ПУШКЕВИЧ, минчанка.

ГЛЫБІНКА

Была ў нас вузкакалейка

У апошні час шмат гаворыцца аб развіцці сярэдніх і малых гарадоў Беларусі. Праблема сур'ёзная, запушчаная. Свой вывад я хачу пацвердзіць некаторымі фактамі. Праз наш Навагрудскі раён праходзіла вузкакалейка Наваельня—Любча. Яе пабудавалі яшчэ кайзераўскія акупанты ў 1916 годзе, каб дастаўляць снарады на фронт, які стаяў у той час нерухома па берагах рэк Нёмана і Сервячы больш за два гады.

Дык вось па гэтай вузкакалейцы рухаліся саставы з 5—6 вагонаў, пры гэтым 1—2 былі пасажырскімі. Палівам для паравозаў служылі вугаль, дровы і нават торф. Калі Заходняя Беларусь адышла пад пратэктарат Варшавы, польскі ўрад планаваў пашырыць яе каляю, прадоўжыць да злучэння з чыгункай Ліда—Маладзечна. Вузкакалейка працавала аж да семідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Ліквідавана была па рашэнні ўрада БССР. Рэльсы і шпалы дэманціравалі і іх забрала чыгунка. Мне як галоўнаму інжынеру аўтабазы давялося прымаць памяшканне Навагрудскага чыгуначнага вакзала. Яго мы перабудавалі ў сучасны аўтавакзал.

Другі прыклад. З даўніх часоў у горадзе Навагрудку працаваў мясакамбінат, які меў лядоўню, вяндлярнае і іншае абсталяванне, вырабляў мяса, каўбасу, розную паўфабрыкатную прадукцыю. Па загадзе Мінска камбінат быў закрыты, абсталяванне парэзалі і здалі ў металалом. А жывёлу з Навагрудскага раёна пачалі вазіць на Слонімскі і Ваўкавыскі мясакамбінаты на адлегласць 100—200 кіламетраў. Скажыце, ці ж гэта па-гаспадарску? Каму патрэбна такая канцэнтрацыя перапрацоўчых прадпрыемстваў?

Пасля вайны паблізу ад горада пабудавалі птушкафабрыку. Устанавілі сучаснае абсталяванне, укамплектавалі кваліфікаванымі кадрамі, і яна паспяхова працавала да семідзесятых гадоў. І зноў жа па загадзе з Мінска яе закрылі, абсталяванне разбурылі, а памяшканне перадалі вучгасу мясцовага саўгастэхнікума. Я не разумею: кайзераўскія акупанты будавалі вузкакалейку, польскія ўлады планавалі яе прадоўжыць і пашырыць каляю, а беларускім (лічы расійскім) бальшавікам, якія збіраліся будаваць камунізм ва ўсім свеце, вузкакалейка не спатрэбілася. Можа, усё ж вярнуцца да гэтай праблемы?

А пра што гаворыць такі факт? У горадзе з даўніх часоў працавала валяльна-лямцавая фабрыка, якая вырабляла валёнкі і другую лямцавую прадукцыю. Сыравіну ж пастаўлялі тутэйшыя сяляне. Калі іх загналі ў калгасы і авечак яны трымаць не змаглі, воўну вазілі з Сярэдняй Азіі. З развалам Саюза вазіць сыравіну з-за мяжы стала стратна і фабрыка закрылася.

У мястэчку Вераскава працаваў спіртзавод, які з дробнай нізкагатункавай бульбы вырабляў спірт-сырэц. Па загадзе раённай вертыкалі яго перадалі мясцоваму калгасу. Ад кіраўніка калгаса патрабавалі павелічэння ўраджайнасці збожжа, надояў малака, а не вытворчасці спірту. Таму ён, каб пазбавіцца ад лішніх клопатаў, закрыў завод.

Працавалі ў раёне тры цагляныя заводы. Два вырабляллі цэглу і вапну, трэці — цэглу і кафлю. Тэхналогія і абсталяванне ў іх было старое, а дзяржава своечасова не забяспечыла крэдытамі для набыцця сучаснага абсталявання, таму яны ўсе тры закрыліся.

Працаваў у горадзе піўзавод, які гатаваў піва, хлебны квас і іншыя напоі. У апошні час ён не мог канкурыраваць з іншымі вытворцамі, таму яго перадалі ў падпарадкаванне Лідскаму піўзаводу. Кіраўніцтва апошняга ў хуткім часе спыніла выраб піва, пачалі вырабляць віно, якое карыстаецца попытам толькі ў бамжоў і п'яніц.

Адразу пасля вайны ў горадзе пабудавалі гароднінасушыльны завод. Устанавілі сучаснае абсталяванне. Доўгі час сушылі садавіну і гародніну, выціскалі сок і вырабляллі кансервы. Але цяпер і гэтага прадпрыемства няма.

Я магу прывесці яшчэ шэраг іншых прыкладаў, якія сведчаць пра заняпад малых гарадоў, у дадзеным выпадку — Навагрудка. З такой сітуацыяй мірыцца, вядома, нельга. І добра было б, каб сённяшнія высокія чыноўнікі не схавалі ўказ прэзідэнта пад сукно, а сапраўды ўзяліся за адраджэнне самых розных прадпрыемстваў у глыбінцы, там, дзе жыве нямала людзей і дзе надзвычай востра стаіць праблема працаўладкавання.

В.А.КУЗЬМІЧ, жыхар Навагрудка.

Показуха — это не забота о людях

Живу я в городе Крупки Минской области. По возрасту человек уже немолодой. Но оставаться равнодушным к тому, что происходит в последние годы в Беларуси и, в частности, в нашем городе, я не хочу. В своем письме хотел бы рассказать, как у нас готовились к ставшему уже сугубо национальному празднику "Дожинки", которые, правда, у нас так и не состоялись, а были перенесены в другой район.

По двум главным улицам, где намечался маршрут для приглашенных на праздник гостей, срочно уложили новый слой асфальта. Тротуары по этим улицам выложили плиткой. Старые покосившиеся дома прикрыли наспех покрашенными ажурными заборами.

А теперь о том, где мы, жители города, считаем, должны быть тротуары в первую очередь. Это с улицы Ленина до школы №3, больницы и ФОКа. Но так как эти объекты находятся в стороне от предполагаемого гостевого маршрута "Дожинок", то, значит, и благоустраивать этот участок дороги не обязательно. Так решил наш председатель исполкома А.С.Горнак. А здесь, на этом 200-метровом участке дороги, положили поперек четырех "полицейских". Все просто и быстро.

Улица Кирова у нас считается одной из центральных. Ее приукрасили быстро. Но жителям от этой заботы стало еще грустнее. Под новым слоем асфальта и тротуарной плитки похоронена их последняя надежда на то, что когда-нибудь и на их улице будет праздник. Водопровод и газ теперь уже точно на этой улице класть не будут. А для местной власти главное — это показать, что программа "Благоустройство" в городе выполняется. Чиновникам исполкома наплевать на то, что на улице всего четыре колодца. И что здесь живет много пенсионеров. Они решили: кому нужен водопровод и газ, пусть прокладывают через огороды с параллельных улиц, а мы будем считать эту улицу благоустроенной.

Более двух лет закрыта районная библиотека, а для чинуш исполкома это, видите ли, не показатель. Вместо закрытой библиотеки дали добро на открытие двух точек по продаже на разлив спиртного. Одну в продовольственном магазине, напротив здания Дома культуры, а вторую — рядом, через 150 метров, в здании телемастерской. Это чтобы уже наверняка никто и не вспомнил о библиотеке.

Может быть, кто-нибудь из жителей такого же небольшого городка, как наш, на страницах "Народной воли" расскажет о делах и проблемах своего местечка. Неужели везде местные власти настоящую заботу о людях подменяют показухой?

И.Н.АЛЕКСЕЕВИЧ, житель г.Крупки.

«НЕПРИЧЕСАННОЕ» ПИСЬМО

Опять обдирают пенсионеров

Вспомним историю.

Декретом Ленина земля бесплатно передавалась народу. Правда, это никогда не было сделано. А в Беларуси за землю теперь надо платить, иначе ее у тебя отберут.

На этот раз опять страдают пенсионеры-дачники. Согласно указу президента, они должны зарегистрировать свои права на участки, а попросту — выкупить землю у государства. Как будто они прилетели с планеты Марс, а не жили здесь раньше. А кто у нас дачники? Это в основном пожилые люди, которые еще держатся благодаря изнуряющему труду на дачах. И вот у них власти решили отнять средства к существованию.

Раньше у пенсионеров отняли льготы на лекарства, а сейчас необходимо заплатить за свои участки до 1 октября 2008 года, иначе их отберут.

В Указе №50 от 28 января сказано, сколько надо заплатить. Во-первых, надо отдать 140 тысяч рублей. Только после этого "Белгипрозем" или Госкомитет по имуществу будет решать ваше дело, чтобы дать вам участок в собственность. Далее 31,5—35 тысяч рублей нужно выложить за регистрацию (в зависимости от формы собственности). Но если у вас есть на участке домик, то нужно заплатить еще 105—140 тысяч рублей — за оформление техпаспорта. При строении до 50 квадратных метров или более.

У вас возьмут еще 28 тысяч рублей, опять за регистрацию. Итого у пенсионера отнимут примерно 340 тысяч рублей. Несколько лет назад создавались садоводческие товарищества для народа. Как обычно им выделялись бесхозные земли: болота, торфяники, неудобица, которые потом люди превращали в цветущие участки. И делалось это неимоверно тяжелым трудом пенсионеров, которые немало средств из своей зарплаты вкладывали в благоустройство участков, прокладывание дорог, электроэнергии, водопроводов. И ничего бесплатно государство не делало. Сейчас власти увидели в дачниках лакомый кусок, где можно взять деньги на "силиконовые долины", дворцы, развлекательные мероприятия и прочие амбициозные проекты.

Увеличение пенсии на несколько процентов не компенсируется затратами дачников на приватизацию дач.

Теперь, после опубликования указа, многие пенсионеры вряд ли захотят заниматься дачным хозяйством, а дачи будут зарастать и пустовать.

Что нас ждет, трудно сказать, но такое отношение властей к пожилым людям наводит на мысль, что все делается для того, чтобы не улучшить, а ухудшить их жизнь.

А.К.СИДОР.

г.Борисов.

ОБРАТНАЯ СВЯЗЬ

Что думают наши читатели об аресте Евгения Шигалова?

Самые разные мнения и версии высказываются на сайте "Народной воли" www.nv-online.info об аресте известного белорусского предпринимателя Евгения Шигалова. Вот лишь некоторые из них.

М.А.Нарачанский:

— Что касается ареста Евгения Шигалова и высказывания по этому поводу президента, то этот бизнесмен, по всей видимости, давал взятки чиновникам, раз они от него требовали! Но делал это не от широты души, а ради того, чтобы дело делалось! Я верю, что и землю для создания рынка, он тоже, возможно, получил не совсем законно! Ну и что из того?!

Братцы мои, подумайте вот о чем: этот человек, в отличие, допустим, от российских олигархов, сделал свой капитал не на нефти или металле, или "прихватизировав" уже построенный завод. Он своим умом и трудом создал практически на пустом месте этот огромный рынок, с сотнями рабочих мест, и не стал вывозить заработанный капитал из страны. Да и в политику, без нужды, не стремился лезть особо!

Мое мнение такое: я бы на месте нашего президента не наказывал таких людей как он, а, наоборот, наградил и поставил на высокую государственную должность. А вот чиновников-"прилипал", тех да, обязательно посадил бы, чтоб другим неповадно было мешать людям, хорошо умеющим делать свое дело!

Насколько бы лучше жила наша Родина, если бы у ее руля стояли такие талантливые менеджеры, как этот человек! А так: ну посадят беднягу Шигалова. Разрушат его бизнес, подобно тому, как это проделали с Андреем Климовым, и кому от этого будет лучше?! Десятки других предприимчивых людей, глядя на такое дело, трижды подумают, прежде чем вкладывать свои деньги в нашу экономику! А в результате не будет развития и проиграем все мы! Таланты, в какой бы сфере они ни находились, стоит холить и лелеять!

С уважением, любящий свою Родину, гражданин Белоруссии!

Виктор:

— Спадар М. А. Нарачанский, вы подписались "любящий свою Родину, гражданин Белоруссии", ну так вот — возьмите в руки свой белорусский паспорт и внимательно посмотрите на него — вторая строчка сверху вас, наверное, удивит, но там написано "Республика Беларусь" и никак не "Республика Белоруссия". Но это так — лирическое отступление.

Евгений Шигалов построил свою финансовую империю не в нормальной конкурентной среде, где все играют по правилам (а такой среды, априори, не может быть при ЭТОЙ власти). Он активно пользовался связями среди чиновников, давал взятки, искал себе "крышу" и покровителей, точно так же, как и наши правители, считал, что законы для него не писаны, если имеешь доступ к "телу". Он прекрасно знал, что "играет в футбол на минном поле".

Политикой не интересовался? Не видел, как забирают бизнес и разоряют других? Думал, его это не коснется? Беззакония, творящиеся в стране, его устраивали? Ну так сейчас у него будет много времени обо всем этом поразмыслить...

Лора:

— Коррупция была, есть и будет, но, как говорится, рыба гниет с головы. И кто с этим ведет так называемую "борьбу" с коррупцией — сам погряз в ней. Сейчас ведет необъявленную войну с народом, который еще что-то в силах делать для блага народа. Идут подставы со стороны правоохранительных органов и неплохо получается у них. Тюрьмы переполнены "экономическими" заключенными. За убийство столько не дают!! Конечно, кто с этим не сталкивался, тот далек от понимания. Но кто столкнулся — это ужас! Есть такие так называемые оперативные эксперименты со стороны ОБЭП, когда даются липовые паспорта и имена людям, составляется сценарий и вперед. Особенно у них получается так: представляются российскими инвесторами и готовыми работать и вкладывать деньги и т.д. и т.п. Кто не нужен из директоров и т.п., тот обречен. Любыми способами даются чемоданы с деньгами и просто деньги, обманывают, подстрекают, и тюрьма тебе обеспечена. Берегитесь, люди! Если есть возможность, надо уезжать отсюда, борьба с этим бесполезна: "рука руку моет".

Болт:

— Лукашенко обещал "после праздников" вызвать к себе и разобраться с пятнадцатью коррупционерами от власти. Ну и где они? В очередной раз откупились или как? Слово нужно держать. Ведь об этом было заявлено всему народу и национальному собранию в очередном послании...

Лора:

— Пусть бы человеку дали подписку о невыезде, да и решали потом: кто прав, кто виноват. Так нет, чуть что — сразу в тюрьму. А там, пока разберутся не спеша (а куда им спешить), — здоровье уже никакое. Это только у нас по телевизору все белое и пушистое (и права человеку, и здоровье нации и т.д.), а на самом деле никому и дела нет до человека. Да и не свое — и не болит. Неправильно все это...

КАЛІ Б Я БЫЛА ПРЭЗІДЭНТАМ...

Аб'явіла б вайну п'яніцам

Перш чым пачаць разважаць аб тым, што я зрабіла б на вышэйшай пасадзе, распавяду крыху пра сябе. Мне зараз 69 гадоў, у мяне дзве сястры, старэйшыя. Іх лёс незайздросны, а дакладней, жахлівы. Бо звязалі сваё сямейнае жыццё з выпівохамі, а пазней яны сталі алкаголікамі. Нарадзілі ад іх дзяцей, якія сталі такімі ж.

Я з маленства бачыла і перажывала ўсе іх пакуты, бо жыла побач. Яшчэ не ведаючы жыцця, я дала зарок: "Ніколі не звяжу свой лёс з п'яніцай і ніколі не нараджу ад яго дзіця". У выніку такога рашэння я засталася адзінокай. Але горкі лёс мяне так і не абмінуў. Цяпер я вымушана жыць разам з пляменніцай, якая п'е, п'юць яе муж і сын.

Вялікая колькасць жанчын маёй роднай Беларусі пакутуюць ад гэтага гора, і яны пагадзіліся б са мной, што трэба вырашаць гэта пытанне! А як? Спробы былі (і неаднойчы) на дзяржаўным узроўні. Усе памятаюць антыалкагольную кампанію М.С.Гарбачова. А вынікаў ніякіх.

Дык вось, з чаго я пачала б сваё прэзідэнцтва. На першым плане, зразумела, — усталяванне Беларускай дзяржаўнасці і школьная рэформа. Трэба ўводзіць такую дысцыпліну, як паводзіны чалавека ў жыцці, і рабіць гэту працу пачынаючы з першага класа. Неабходна паказваць дзецям, як жывуць, як выглядаюць, што гавораць, дзе спяць, як паводзяць сябе тыя ссінелыя і апухлыя ад спіртнога, ад холаду і голаду людзі. Дэманстраваць відэастужкі ў школах. Многа гаварыць пра тое, што такое можа здарыцца з кожным. Паказваць, як пакутуюць блізкія людзі.

Трэба забараніць рэкламу алкагольных напояў і піва. Меней паказваць па тэлебачанні кінастужкі, дзе так смачна выпіваюць. І рабіць усё гэта ўпарта і настойліва, каб ні на хвіліну не забывалася, што часовая весялосць можа стаць трагедыяй на ўсё жыццё. Толькі праз выхаванне можна выратаваць нацыю. А дзяржава не павінна нажывацца на людской бядзе.

Будучы прэзідэнтам, я б з тэлеэкрана неаднойчы падымала гэту тэму і звярталася б з просьбай да бацькоў: "Будзьце ўважлівымі да сваіх дзяцей, будзьце добрым прыкладам, вы адказныя за тых, каго нарадзілі". І гэтым клопатам я заслужыла б павагу сваіх грамадзян.

Л.ПЯНЬКОЎСКАЯ, жыхарка г.Мінска.

ВЗГЛЯД

Не возрождаются, а вымирают

Здравствуйте!

Очень давно писал письмо в свою любимую газету, на этот раз решил высказать все, что наболело. Наш президент немало делает, чтобы мы, особенно пенсионеры, быстрее умирали. Посмотрите, сколько стоят лекарства, да еще купишь эти дорогие таблетки, а они не помогают, так как врач неправильно назначил.

Аптеки растут как грибы после дождя. Взять нашу "Малиновку-4", будем считать от поликлиники №25 в сторону улицы Слободской. Две остановки — 8 аптек. В общем, устроили бизнес на лекарствах, очень выгодно купить за рубль, а продать за 5 рублей. И все аптеки частные.

Во всех европейских странах уважают пенсионеров, они радуются, что могут пожить для себя, отдохнуть. А нашим пенсионерам надо думать, как дожить до смерти! На глазах деревни пустеют, а власть вопит, что возрождаются. Да не возрождаются, а вымирают.

Посмотрите еще на одну проблему. Студентам негде жить, как, впрочем, и молодоженам, а власть хочет практически отремонтированную гостиницу "Беларусь" разбурить и на ее месте построить новый комплекс. Неужели в Минске мало места для нового строительства?

Взять санаторий "Крыніца" в Ждановичах, один корпус уже много лет пустует, кстати, в живописном месте. А ведь его можно было переоборудовать под общежитие или малосемейку, и пусть бы жили люди в нем.

Словом, гибнем на глазах, а говорим, что возрождаемся. Спасибо, родная "Народная воля", что ты живая, есть что почитать и кому пожаловаться.

Твой друг —

В.С.РОГОВСКИЙ, пенсионер.

Апазіцыя павінна добра пазмагацца за дэмакратызацыю выбарчага працэсу

Дзень добры, шаноўныя народавольцы!

Дасылаю вам свае меркаванні наконт нашага жыцця, хаця ўсё гэта даўно вядома, але, ідучы насустрач "выбарам", якія сёлета павінны адбыцца, нядрэнна было б напомніць чытачам аб нашым жыцці, бо, як кажуць, паўтарэнне — маці вучэння.

Я мяркую, што сёлета апазіцыя павінна добра пазмагацца за дэмакратызацыю выбарчага працэсу, без якога так званыя выбары не маюць сэнсу.

Вось і ўсё. Буду вельмі ўдзячны, калі мае меркаванні пабачаць свет на старонках нашай шаноўнай газеты.

З павагай —

Мікалай КУКСО, жыхар г.п.Івянец.

ЕСТЬ ВОПРОС

Потому что без воды...

Что-то я так и не могу разобраться, на какой срок будут отключать горячую воду в Минске и что это за участки, где ремонтники не обещают уложиться с ремонтом теплотрасс в отведенные две недели?

Ерофеева Н.И.

К сожалению, точных адресов участков, где горячую воду отключат на больший срок, чем на отведенные городскими властями две недели, в РУП "Минэнерго" не называют. Видимо, это государственная тайна. Известно только, что это касается девяти участков из 87. Это касается старых теплотрасс, на которых нужно выполнить большие объемы работ, прежде всего речь идет о районе минской ТЭЦ-3.

Елена НОВИКОВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 МАЯ 2008 г.

ЧУЛІ?

Каталіцкі біскуп стаў прэзідэнтам

У прэзідэнцкіх выбарах, што адбыліся ў Парагваі, перамог 58-гадовы каталіцкі біскуп Фернанда Луга. Ён набраў 40,8 працэнта галасоў, а ягоная галоўная саперніца Бланка Овелар — толькі 30,8 працэнта.

Паводле выбарнага права Парагвая, перамогу ў выбарах атрымлівае кандыдат з простай большасцю галасоў. Упершыню ад 1947 г. Парагваем будзе кіраваць чалавек не з кіруючай партыі Каларада, якая праславілася скарумпіраванасцю, а чалавек з апазіцыі.

Кодэкс Кананічнага права каталіцкага касцёла забараняе духавенству публічна ўдзельнічаць у палітыцы. Таму яшчэ ў 2006 г. Фернанда Луга папрасіў Апостальскую сталіцу вярнуць яго ў свецкі стан. Аднак атрымаў забарону забарону выконваць святарскія паслугі. Таму новы прэзідэнт Парагвая больш належыць да духавенства. Сапернікі Фернанда ў перадвыбарнай гонцы звярталі на гэты факт увагу, сцвярджаючы аб юрыдычнай перашкодзе да ўдзелу ў выбарах. Аднак Найвышэйшы суд Парагвая адхіліў іхныя прэтэнзіі. Новаабраны прэзідэнт перапрасіў Касцёл за тое, каб замест святарскай паслугі выбраў палітыку. "Калі мая пастава і непаслухмянасць кананічнаму праву прычынілі боль, шчыра прашу прабачэння ў народа Касцёла", — засведчыў Луга.

Фернанда Луга паходзіць з сям'і, з якой шмат хто цярпеў палітычны пераслед і высылку ў часы "апошняга дыктатара Паўднёвай Амерыкі", як называлі прэзідэнта Парагвая Альфрэда Штроснэра. Фернанда вырас у атмасферы палітычнага змагання з несправядлівасцю. Таму, калі стаў святаром, яго і надалей цікавілі пытанні сацыяльнай несправядлівасці, змаганне за дабро для сваёй Радзімы. Пасля святарскай працы ў ордэне вербістаў Фернанда атрымаў біскупскую сакру і 10 год (1994—2005) адпрацаваў у вельмі беднай дыяцэзіі Сан Педро. Напэўна, безупынны кантакт з бедным, прыцесненым насельніцтвам, праца сярод іх і для іх сталі для Фернанда вырашальным штуршком, каб працаваць для свайго народа ў якасці палітыка. Луга стаў на чале каліцыі левых цэнтрыстаў, хоць сам шматкроць тлумачыў, што не належыць ані да левых, ані да правых таму, што "ў Парагваі ёсць толькі тыя, хто крадзе, і тыя, каго абкрадаюць".

Абвяшчэнне перамогі "біскупа ўбогіх" выклікала бурную рэакцыю сярод выбаршчыкаў. Людзі выбягалі на вуліцы, кіроўцы сігналілі з аўтамабіляў. Для шматлікіх выбаршчыкаў гэтая перамога Фернанда — прамень надзеі, спадзяванне, што нешта зменіцца. Грамадская сітуацыя краіны не найлепшая. Каля 40 працэнтаў парагвайцаў жывуць у вялікай нястачы. Усёй краінай і яе маёмасцю кіруе каля 20—30 сем'яў-багацеяў. А рэшта — збяднелыя сяляне, якія не маюць аніякіх правоў. Пэўна таму за Фернанда галасавалі гэтыя найбяднейшыя. Каталіцкі касцёл у Парагваі мае вялікі маральны аўтарытэт, таму гэты аўтарытэт беднякі бачаць і ў Фернанда Луга. У сваёй паслявыбарнай прамове новаабраны прэзідэнт падкрэсліў, што народ вырашыў, якой павінна быць радзіма. "Вы рашыліся вызваліць Парагвай. Дзякую", — сказаў Луга.

Дырэктар прэс-службы Апостальскай сталіцы а.Федэрыка Ламбардзі запэўніў, што экскамуніка біскупа-прэзідэнта абсалютна непрымальная. Ватыкан разглядае магчымасць вяртання біскупа Фернанда Луга ў свецкі стан.

ФОТОВЗГЛЯД

Бывшая итальянская модель Мара Карфанья стала министром по вопросам равных возможностей в новом правительстве Сильвио Берлускони.

Британская королева Елизавета II осматривает в Стамбуле ковры в ходе официального визита в Турцию.

Странные мутации

Странные мутации плодовых деревьев наблюдаются в нескольких селах румынского уезда Мехединци. На деревьях алычи вместо обычных фруктов стали появляться плоды, похожие на стручки фасоли или акации.

Местные жители недоумевают и даже боятся таких метаморфоз. Еще в провинции перестал расти лук, на корню засыхает чеснок, яблони дают уродливые и треснувшие плоды, "сгорает" виноградная лоза, передает ИТАР-ТАСС.

«Бешеные муравьи»

Штат Техас переживает нашествие "бешеных муравьев", которые служат причиной коротких замыканий и поломок компьютеров, сообщает агентство АР.

Разновидность муравьев, принадлежащая к подвиду "Paratrechina" и уже получившая в народе прозвище "бешеных муравьев Рэсберри", отличается повышенным интересом к электроприборам и технике, который ученые пока не могут объяснить. Муравьи вывели из строя насосы системы канализации, вызывают многочисленные сбои в работе систем пожарной сигнализации.

Предположительно муравьи попали в США на борту грузового самолета или корабля и распространялись из Хьюстона. Ученые не знают, откуда именно прибыла новая разновидность муравьев, однако их ближайшие родственники обитают в странах Карибского бассейна.

ПУТЕВЫЕ ЗАМЕТКИ

Сакартвело: приглашение на дегустацию

Несколько лет назад некий Ваха, грузинский вор в законе, обосновавшийся в Беларуси, наладил розлив "грузинского вина" на каком-то нашем провинциальном заводике. И все у него шло прекрасно на протяжении нескольких лет, пока в маленький городок Калинковичи не приехала следственная группа Генеральной прокуратуры, в составе которой оказался большой любитель грузинских вин. Купил он себе на вечер бутылочку "Киндзмараули", попробовал, выплюнул и... закрутилось крупное уголовное дело по факту производства контрафактного продукта. Удивительным было не то, что кто-то где-то под видом грузинского вина нечто бодяжил. Удивительно, что белорусы пили это пойло, будучи твердо уверенными, что таким и должен быть любимый напиток Иосифа Сталина.

— На самом деле Сталин предпочитал домашние вина, — рассказывает директор крупнейшего экспортера грузинских вин, предприятия "Тифлисский винный погреб" Петр Атаман. — Но из бутилированных, как утверждают, действительно любил **"Киндзмараули"**. В настоящем "Киндзмараули" обязательно чувствуются оттенки вишневой косточки и черной смородины. Это темно-красное природное полусладкое вино из сорта винограда "Саперави", но выращен он должен быть исключительно в районе села Киндзмараули в Кварельском районе восточной Грузии. Грузины любят это вино не только за неповторимый бархатистый вкус, но и потому, что оно прекрасно смягчает действие острых соусов. Кстати, "Киндзмараули" начали выпускать только в 1942 году, так что никак нельзя сказать, что пристрастие вождя народов к этому вину — это ностальгия по напиткам бурной молодости.

"Саперави" — один из самых распространенных сортов винограда, выращиваемых в Грузии. И одноименное вино, соответственно, указывает просто на сорт винограда. Это же касается "Ркацители", "Алиготе", прижившегося в Грузии французского сорта "Каберне Савиньон" и других. Эти вина подешевле и выпускается их больше. А вот указание на микрозону, где рос виноград, — это уже признак элитности вина. "Киндзмараули" — яркий тому пример.

В Беларуси есть жуткое слово "Госконтроль", а для виноградарей и производителей вин Грузии столь же жутким является слово "Самтрест". Это никому не подчиняющаяся организация, которая в рамках закона "О лозе и вине" следит как за виноградниками, так и за готовым напитком. "Самтрест" разбил всю страну на микрозоны и ведет постоянный реестр всех виноградников. Зная, например, сколько гектаров "Саперави" было высажено возле села Киндзмараули, несложно подсчитать, сколько может быть произведено вина одноименной марки.

Для тех, кто решил что-то там к чему-то подмешать, дабы увеличить объемы, и под видом элитного вина поставить на внешний рынок, мягко говоря, алкогольный коктейльчик, существует жесткая система контроля качества. Виноделы от нее стонут. Но после скандала с Россией, которая закрыла свой рынок для грузинских вин, правила введены жесткие. Каждая экспортная партия (и каждое наименование вина в ней) проходит двойной контроль. Химический, когда определяется химический состав напитка, и наиболее сложный тест — дегустационный. Комиссия, состав которой постоянно меняется, и в которую входят не только грузинские эксперты по винам, но и зарубежные специалисты (например, немецкие), пробует напиток на вкус. Бракуют, говорят виноделы, нещадно. Но без разрешения "Самтреста" из страны не может выйти ни одна партия вина. Грузия серьезно взялась восстанавливать реноме своего национального напитка.

— Вообще, обвинения, которые Россия выставила грузинскому вину, для специалистов смешны. — Петр Атаман — молдаванин, раньше возглавлял аналогичное предприятие в Молдове, но за грузинское вино болеет, как за родное. — Особенно возмутительно было, когда мы услышали про то, что в вине обнаружены пестициды. Вся Грузия знает, что из-за отсутствия средств никакие удобрения в виноградники не вносились уже более десяти лет. И ставили этот вопрос как серьезную проблему на государственном уровне, ведь земли истощаются, в разумных количествах их просто необходимо подкармливать. Но пока грузинское правительство решало, как помочь виноградарям и профинансировать закупку удобрений, Россия уже нашла в вине пестициды. Ну не бред?

Мы идем по современному предприятию, оснащенному итальянским оборудованием, которое из-за российской блокады грузинских вин вынуждено было сократить объемы производства в разы. Главный винодел завода Александр любые намеки на то, что Грузия под видом вина поставляла на российский и иные рынки всякую бурду, воспринимает как личное оскорбление.

— Вы знаете, сколько стоит перевозка вина? — спрашивает он у меня.

— Не знаю, но, наверное, до России не дешево.

— И вы полагаете, что за такие деньги мы бы возили из Грузии компот? Они сами что-то там на своих заводах разливали под видом грузинских вин, а нас обвинили в подделках. Вина, разлитые в Грузии, всегда были винами. Даже в советские времена, когда Москва душила планами и социалистическими обязательствами, в Грузии шептализацией не занимались, это Молдова этим славилась.

Петр Григорьевич Атаман молча соглашается и поясняет мне, что "шептализация" — это когда в вино при брожении добавляют сахар, чтобы увеличить объем продукта на выходе. Между прочим, международный термин, а так удивительно подходил к нашей действительности: технолог с директором пошептались, и выполнили план... Кстати, во многих странах эта процедура официально разрешена. Например, во Франции. Другое дело, что искусственное увеличение сахара там строго регламентировано.

— В Грузии в вино нельзя добавлять ни грамма сахара, — говорит Александр. — Да нам и не надо. У нас виноград растет изумительный.

Ну, положим, к винограду нужны еще и умелые руки. "Тифлисский винный погреб" мне был интересен вот чем. Авторитетнейшего мирового эксперта Хью Джонсона, автора нашумевших книг "Ежегодный карманный винный справочник", "Большая винная энциклопедия" и "История вина" года два назад пригласили в Москву на пафосную дегустацию самых интересных и достойных вин нашего региона — из Италии, Румынии, Молдавии, Грузии, Украины, России. И что, как вы думаете, Хью Джонсон назвал лучшим вином? **"Мукузани"** урожая 2003 года именно от "Тифлисского винного погреба". Александр охотно предлагает мне прославившийся напиток, который хранится в пыльных бутылках в "почетном подвале" завода, хотя сам его лучшим не считает.

— "Мукузани" — одна из старейших винных марок Грузии. Вино выпускается с 1888 года, — . рассказывает Александр. — Изготавливают его из все того же "Саперави", но выращенного в селах Мукузани и Телиани в Кахетии. Выдерживают не менее трех лет. Причем, как и коньяк, в дубовых бочках. Кстати, "Мукузани" рекомендуется пить со льдом для утоления жажды в сильную жару. И не слушайте "специалистов", которые говорят, что красное вино обязательно должно быть комнатной температуры. У вина есть и запах, и вкус. Если они недостаточно богаты, тогда требуется подогреть вино, чтобы активизировать его природные ароматы. Но если вино качественное, никаких дополнительных ухищрений не требуется.

— А какое ваше любимое вино? — мне было очень интересно, что предпочитает один из лучших виноделов Грузии.

Александр отвечает, не задумываясь: "Белое **"Напареули"**.

Более известно красное "Напареули", но, оказывается, есть и белое. Это действительно удивительно тонкое сухое вино, сделанное из "Ркацители", выращенного в строго определенной зоне (как вы уже, наверное, догадались, это село Напареули в Кахетии). В отличие, например, от "Гурджаани", в нем нет горчинки, вино кажется даже не столько виноградным, сколько легким фруктовым. Это, кстати, тоже одна из древнейших марок.

— Некоторое время назад специалисты заинтересовались так называемым "французским парадоксом", — к нашему разговору подключается шеф лаборатории контроля качества, кандидат биологических наук Мзия. — Во Франции и в той же Грузии достаточно низкий уровень сердечно-сосудистых заболеваний, и это при том, что и жирной пищи здесь едят много, и пьют много. Разгадка оказалась в вине — полифенольные антиоксиданты, как оказалось, не только выводят из организма радионуклиды, но и благоприятно влияют на сердечно-сосудистую систему, а также на легочную систему. Кстати, разговоры о том, что антиоксиданты есть только в красных винах — это байки непрофессионалов. Качественные белые вина не менее, а может, даже более полезны. Особенно для тех, у кого проблемы с легкими.

По секрету Мзия рассказала мне, что сделать белое сухое вино значительно сложнее, чем красное. У белых вин настолько чистый вкус, что невозможно "спрятать" недостатки, и потому неопытные виноделы за белые вина, как выяснилось, просто не берутся. Кстати, некоторые белые вина тоже выдерживают в дубовых бочках. Например, уже называвшееся **"Гурджаани"** и знаменитое **"Цинандали"**. Эти вина выдерживают не менее двух лет, из них не менее полугода — именно в бочках.

И коль уж разговор пошел доверительный, я поинтересовалась у Мзии, когда она сама попробовала вино?

— Лет в пять, — нисколько не смущаясь, ответила женщина. — Это то, что я помню. А вообще, у нас детям дают немножко вина с раннего детства. В Грузии издревле считалось, что вино сохраняет все полезные свойства винограда. И сейчас, уже как биолог, я вам скажу, что это правда. Вино — забирает от винограда все полезные вещества и сохраняет их все, кроме глюкозы.

— А как же алкоголизм? — удивилась я. — В Беларуси вам любой врач скажет, что спиртное и дети — это несовместимые вещи.

— Вино — особый напиток. И в Грузии практически нет алкоголизма, только в горных районах, где пьют чачу. От хорошего вина алкоголиками не становятся. Поэтому запретите у себя в стране так называемые плодовоягодные вина, сделайте доступными качественные вина, убрав лишние налоги, и только тогда решите проблему алкоголизма. В России, Беларуси, Украине пьют, чтобы напиться. В Грузии другая философия, у нас *ребенка* учат пить в семье, чтобы он умел не напиваться, достойно вести себя за столом, поддерживать беседу, разбираться в винах.

Действительно, проведя в Грузии не один день, где все пьют вино и пьют много, могу вас уверить, что столько алкоголиков, сколько в Минске, там и близко нет. И средняя продолжительность жизни в этой стране высокая — 74 года, а в той же Беларуси — 68 лет. Да и то, как известно, у нас более или менее приличную цифру статистике дают женщины, а мужчины едва доживают до 60, в Грузии такого серьезного разрыва в продолжительности жизни мужчин и женщин не наблюдается. Более того, сами грузины утверждают, что статистику долгожительства им подпортили недавние войны, которые, как известно, лет не прибавляют, зато прибавляют убитых и раненых.

Впрочем, даже если наше правительство вдруг ради здоровья нации каким-то чудом откажется от производства "чернил" с разнообразными завлекательными названиями, рядовой белорус вряд ли перейдет на грузинские вина. Все дело в том, что они и в самой Грузии не дешевые.

...От грустных мыслей меня отвлекает Петр Атаман, предлагая попробовать знаменитую **"Хванчкару"**. Это одна из самых популярных марок грузинских вин и в России, и в Беларуси, и в странах Балтии. Давно замечено, что в районах с нежарким климатом люди предпочитают полусухие и полусладкие вина. Вообще-то, они рекомендуются к десерту, а не в качестве основного напитка за столом. Но у нас это правило не срабатывает.

— Считается, что именно с "Хванчкары" в Грузии началось производство вин природного полусладкого направления, — рассказывает Петр Атаман. — Точной даты, когда появилось это вино, никто не знает. Известно только, что в 1907 году оно завоевало свои первые международные медали. Производится из сортов винограда "Александроули" и "Муджеретули", выращенных в микрозоне села Хванчкара Рача-Лечхумской зоны. В цвете вина есть даже фиолетовые оттенки, а во вкусе — и малина, и цветочные тона. Когда вы сделаете глоток, во рту долго остается вкус напитка, специалисты называют это "долгим послевкусием".

В 1907 году на международной выставке в Бельгии произошла сенсация. Вердикт дегустационного жюри потряс не только виноделов, но и всю общественность Европы. Строгих и привередливых мэтров поразило и взволновало вино, представленное на их суд князьями Леваном и Дмитрием Кипиани. В результате вину из малоизвестной Грузии единогласно были присуждены высшие награды конкурса — Grand Prix, золотая медаль и жетон бельгийского короля Леопольда II.

Способ изготовления этого вина подсказала сама природа. В незапамятные времена было подмечено, что неожиданные заморозки прерывают процесс брожения сусла, и по этой причине в конечном результате получается вино с весьма своеобразными свойствами. Это и учли князья Кипиани. В итоге появилось знаменитое "кипианевское" вино. "Кипианевским" его называли до 30-х годов прошлого столетия, а затем советские чиновники переименовали вино в "Хванчкару": советским вождям просто было не по статусу пить вино имени каких-то князей, а сам напиток они очень любили.

Следующее вино, которое предлагает мне оценить Петр Григорьевич, **"Оджалеши"**. Несмотря на то, что оно изготавливается из одноименного сорта винограда, это вино выпускается в ограниченных количествах, поскольку растет виноград в сложной местности — на склонах гор в районе села Орбели Цагерского района.

Начало организации производства этого вина приписывают внуку наполеоновского маршала Ашилю Мюрату, женатому на княжне Дадиани. (Кстати, именно его пребыванием в родовом имении князей Дадиани объясняют появление в селе Зугдиди золотой посмертной маски Наполеона.) Это вино с удивительно свежим, я бы даже сказала нежным вкусом и редким для красных вин оттенком барбариса.

В заключение экскурсии по моей просьбе мне предлагают мое любимое вино **"Твиши"**. Как выяснилось, ничего не зная о нем, я выбрала далеко не самый худший напиток. Виноград для "Твиши" (сорт "Цоликоури") выращивается на очень ограниченной территории в Рионском ущелье. Это вино с тонами меда. Очень красивое и на цвет (соломенное), и на вкус — легкий, свежий.

По традиции грузинского гостеприимства ящик "Твиши" мне вручают с собой. Жаль только, что в Беларусь его нельзя было привезти, поскольку норма ввоза через белорусскую границу — две бутылки на брата. А потому я с особым пристрастием расспросила специалистов, как же в наших условиях отличить настоящее вино от подделки?

Специалисты советуют:

Как отличить качественное вино от подделки?

— Обязательно смотрите на этикетке, где разлито вино. Настоящее грузинское вино разливают только в Грузии.

— Помните, что подделывают в основном полусладкие вина. Во-первых, спрос на них больше, а во-вторых, сухое вино имеет характерную терпкость, подделать которую практически невозможно.

— "Хванчкара", "Твиши", "Оджалеши" и другие вина, о которых я вам рассказала, не могут стоить дешево, потому что виноград для них выращивается на очень небольшой территории.

— Если на бутылке "Хванчкары" написано, что вино изготовлено из сорта винограда "Хванчкара" — будьте уверены, что к настоящему напитку оно отношения не имеет.

— Обратите внимание, что написано на этикетке по поводу сахара. Если на сухом вине найдете такую надпись, то не вздумайте его покупать. На сухом вине сахар не указывается.

— На ярлычке на горлышке бутылки марочного вина должен быть указан год изготовления напитка.

— Любое белое вино, будь то сладкое, умеренное или сухое, должно обладать кислотностью. Именно это качество освежает букет. Если белое вино без кислинки, оно не настоящее.

— Не бывает сухой "Хванчкары" или, например, полусухого "Киндзмараули".

— Настоящее грузинское вино, поставляемое на экспорт, разливают только в бутылки из хорошего стекла, которое, кстати, редко бьется даже при падении.

— Если вы капнете вино в стакан с водой, то оно не смешивается с водой сразу. Чем быстрее происходит смешивание, тем больше в вине примесей. Есть и более мудреный способ. Натуральность вина можно определить с помощью глицерина. Если в вино плеснуть глицерин, он опустится на дно сосуда, оставаясь бесцветным. Если же вместо вина — "компот", то глицерин окрасится в оттенки красного или желтого цвета.

— Даже в хорошем вине допускается наличие осадка. Но его не должно быть много, и он не может покрывать все дно бутылки. В марочном вине допускается осадок винного камня. "Правильный" осадок не плавает по бутылке, если ее резко повернуть вниз горлышком и обратно, а быстро оседает.

Как хранить вино?

— Вина рекомендуется хранить в горизонтальном положении. Тогда оно постоянно смачивает пробку, не позволяя ей рассохнуться и раскрошиться.

— Для температуры хранения вин общее правило таково: менее стабильные вина — белое, розовое — требуют большей прохлады (8—10°С), а плотные красные предпочитают температуру повыше. Ни одно вино не любит колебаний температуры, поэтому если уж вы поставили его в холодильник, то выпивайте.

— Тонкие вина не любят яркого света. При взаимодействии с ним в вине начинают происходить химические реакции, влекущие за собой необратимые перемены в качестве. Это заметно даже на глаз: красные вина становятся бледнее, у белых усиливается желтый оттенок.

— Вина не любят резких запахов, которые просачиваются в напиток через пробку. Поэтому вино нельзя хранить в погребе рядом, скажем, с квашеной капустой.

Светлана КАЛИНКИНА.

Минск—Тбилиси.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 МАЯ 2008 г.

РАКУРС

Николай ВЕРКЕЕВ:

«Самое страшное для человека — быть обузой...»

Куда податься человеку, у которого нет ни дома, ни паспорта?
Почему среди бомжей мужчин больше, чем женщин?
На эти и другие вопросы отвечает директор минского Дома ночного пребывания для лиц без определенного места жительства Николай Веркеев.

— Пункт регистрации лиц без определенного места жительства при Доме ночного проживания существует уже 7 лет, — рассказывает Николай Михайлович. — За это время мы никому не отказали в помощи. Многие люди вернулись к нормальной жизни, создали семьи, воспитывают детей и стали вполне законопослушными гражданами своей страны. Я думаю, это хороший показатель, который говорит о многом. Правда, спасение утопающих — дело рук самих утопающих, но иногда человеку необходимо дать шанс, чтобы переосмыслить и пересмотреть свои взгляды на жизнь, а мы как раз и протягиваем эту руку помощи, даем шанс выкарабкаться из жизненного водоворота.

— В Дом ночного проживания попадают добровольно или принудительно?

— Сугубо по собственному желанию!

— Прослеживается ли както дальнейшая судьба людей, которые побывали в этих стенах?

— Очень трудно, просто физически не хватает времени за всеми уследить, хотя периодически эти люди попадают в поле нашего зрения.

— Скажите, кроме государственного финансирования у вас есть какие-нибудь спонсоры?

— Нас поддерживает церковь, она организовывает горячее бесплатное питание и дает духовную поддержку таким людям, помогает нравственно перевоспитаться.

— Лица без определенного места жительства привлекаются к общественным работам в уплату долга за свое содержание либо живут здесь полностью за счет государства?

— На общественные работы люди выходят добровольно, и заработанные деньги идут в их личный карман, так как проживание, питание и медицинская помощь у нас бесплатные. А устроиться на работу можно, взяв направление от центра занятости.

— А кто чаще всего обращается к вам за помощью — мужчины или женщины?

— Чаще мужчины.

— И как вы это объясняете?

— Наверное, мужчины чаще нарушают закон. Как следствие — во многих случаях происходит утеря жилья (выписывают из квартиры родственники или жилье продается). Вот и остаются люди на улице...

— Что дает регистрация лицам без определенного места жительства?

— Регистрация дает право человеку, который не имеет прописки, получить паспорт и оформить пенсию. При желании мы оформляем в дом-интернат постоянного проживания инвалидов 1—2 групп и лиц официального пенсионного возраста при условии, что дети и родственники от них отказались.

— И на какую пенсию могут рассчитывать эти люди?

— Размер пенсии зависит от стажа работы (примерно от 80 до 200 тысяч белорусских рублей), а социальная помощь — 70—80 тысяч.

Молодым людям мы оформляем прописку в Доме ночного проживания и даем возможность какое-то время жить здесь, пока человек не реабилитируется и не встанет на ноги.

— Какие документы необходимы для регистрации?

— Нужен только паспорт.

— А если нет паспорта?

— Сюда приходит паспортистка, и прямо здесь его можно оформить, только нужно иметь в прошлом постоянную прописку и являться гражданином Республики Беларусь.

— В какую сумму обходится содержание одного человека в сутки?

— В среднем сутки проживания обходятся в 13—18 тысяч, месяц — 400—500 тысяч в зависимости от наполняемости приюта и от оказанных услуг.

— Интересно, как относится ваша семья к тому, что вы постоянно общаетесь с бомжами?

— Мы с женой вместе уже 31 год, и она, и дети давно привыкли к моей работе. Раньше я работал в органах внутренних дел и дома появлялся не очень часто. И даже тогда моя работа не вызывала никаких нареканий.

— Можете дать свое определение слову "бомж"?

— Это человек без определенного рода занятий, утративший свои социально полезные и родственные связи.

— Работа как-то повлияла на ваше отношение к людям, может, научила чему-то?

— Безусловно. Я стал терпимее и добрее к людям. Не хочу жалеть бомжей, потому что жалость, на мой взгляд, плохое чувство. Но я им просто искренне сочувствую и стараюсь помочь. Радуюсь, когда это удается. Ведь самое страшное, на мой взгляд, для человека — быть обузой...

Один из тысячи

Сергей Сергеевич Голубцов — инвалид труда. По состоянию здоровья он вынужден регулярно проходить лечение в больнице. Раньше он, как и все благополучные люди, жил в уютной минской квартире с родным братом и его женой. Когда Сергей Сергеевич лежал в больнице, его брат умер. Буквально через месяц золовка по решению суда выписала Голубцова из квартиры. Из больницы он вышел бомжом: паспорт потерян, средств к существованию нет, крыши над головой — тоже. Через месяц скитаний Голубцов пришел в Дом ночного проживания без особой надежды, что там помогут. Но помогли: сделали паспорт, заново оформили пенсию. Теперь он собирает необходимые медицинские справки для того, чтобы перейти на постоянное место жительства в Дом-интернат для пенсионеров и инвалидов.

Мария МЕЛЁХИНА.

ЗДАРЭННЕ

Паветраны шар упаў на вёску

Двое чалавек загінулі і двое былі параненыя ў выніку падзення паветранага шара ў Мінскім раёне. Здарэнне адбылося ў вёсцы Семкава. Падчас навальніцы шар сутыкнуўся з вясковымі хатамі, у выніку чаго некалькі чалавек выпалі з карзіны, а пасля ўдару аб зямлю выбухнулі балоны з газам.

Узгаранне было хутка ліквідавана супрацоўнікамі МНС. Было ўстаноўлена, што загінулі мінскі прадпрымальнік 1964 года нараджэння і яго жонка 1976 года нараджэння. Пацярпелі іх 8-гадовая дачка і інструктар (ён жа ўладальнік аэрастата), якія шпіталізаваны.

Як паведамляе "Інтэрфакс", дзяўчынка з рознымі траўмамі змешчана ў аддзяленне дзіцячай нейрахірургіі Бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

Цяпер раённая пракуратура і камісія Дэпартамента па авіяцыі праводзяць расследаванне.

Эксперты ўстанавілі, што паветраны шар належаў прыватнаму прадпрымальніку. "Аэрастатам АХ-10" валодаў галоўны інжынер аднаго з мінскіх таварыстваў з дадатковай адказнасцю. Паветраны шар быў легальным, яго ўладальнік меў ліцэнзію.

СПАДЧЫНА

Прытулак, дзе ратуецца мова

Мажліва, і не ведалі б за межамі Браслаўскага раёна пра вёску Мількі, калі б не тутэйшая сярэдняя школа-гарадок, адметная выкладаннем на беларускай мове.

Тут родная мова гучыць паўсюдна: і ў садку, дзе толькі восем выхаванцаў, і ў школе, дзе 100 вучняў.

Выхаванне дзяцей на лепшых нацыянальных традыцыях зрабілася кірункам працы мількаўскіх педагогаў каля сямі год таму. Падмуркам гэтай патрыятычнай дзейнасці з'явілася аўтарская праграма, распрацаваная настаўніцай пачатковых класаў Галінай Антанёнак. Праграму вывучылі і ўхвалілі спецыялісты абласнога Інстытута павышэння кваліфікацыі.

І не памыліліся. Неўзабаве школьны кабінет роднай мовы і літаратуры быў прызнаны лепшым у раёне. Вызначаецца ён сваім афармленнем. Тут — цэлая галерэя жывапісных палотнаў, прысвечаных класікам айчыннай літаратуры. Аўтар карцін — колішні настаўнік малявання, хіміі і біялогіі, а цяпер — пенсіянер Іван Рыдзіка.

Дырэктар школы Ганна Антонаўна Корсак катэгарычна не згодная з тымі, хто лічыць беларускую мову перашкодай на шляху да вышэйшай адукацыі ды кар'ерных вышынь.

— Не менш за палову нашых выпускнікоў, — гаворыць яна, — паступаюць штогод у вышэйшыя навучальныя ўстановы і паспяхова навучаюцца там.

Беларускамоўнасць Мількаўскай школы даспадобы і самім вучням, і іх бацькам. Зрэшты, асновай гаворкі тутэйшых жыхароў з'яўляецца беларуская мова. Што, аднак, не шкодзіць вучням нязмушана і беспамылкова карыстацца і другой дзяржаўнай мовай — рускай.

На жаль, такіх навучальных устаноў на Віцебшчыне, як і паўсюль на Беларусі, застаецца ўсё менш. Няма іх, дарэчы, у Браславе, а сярод астатніх райцэнтраў вобласці адзіная беларускамоўная сярэдняя школа існуе толькі ў Глыбокім.

Пра абласны цэнтр і казаць не варта: з ягоных школ родная мова знікла даўно і, відаць, ужо не вернецца пры цяперашняй уладзе.

Толькі зрэдку і быццам бы выпадкова з'яўляюцца беларускамоўныя радкі ў віцебскіх друкаваных СМІ, а тэмы, звязаныя з пачуваннем роднай мовы ў сучасных варунках зрабіліся для ідэалагічных ахоўнікаў нечым накшталт крамолы.

Вось тыповы прыклад. Нядаўна старшыні Віцебскай рады Таварыства беларускай мовы Іосіфу Навумчыку патэлефанавала супрацоўніца рэдакцыі газеты "Віцьбічы", афіцыйнага органа гарвыканкама. Яна паведаміла, што выданне атрымала ліст ад чытача, які цікавіцца станам беларускай мовы ў горадзе і вобласці, яе статусам у сучасных навучальных установах, ведамствах і г.д.

Карэспандэнтка папрасіла старшыню суполкі ТБМ адказаць на ліст чытача, каб газета змясціла гэты адказ.

— Няма праблем, — пагадзіўся Навумчык, — але ж гэта і для вас, і для мяне будзе марная праца, бо газета мой адказ ніколі не надрукуе.

— І ўсё ж паспрабуем, — быў адказ, бо няёмка пакідаць без увагі чытацкі запыт.

Навумчык хутка падрыхтаваў дакладны, шчыры адказ і перадаў яго ў рэдакцыю. А праз колькі дзён яму патэлефанавала тая ж супрацоўніца газеты і папрасіла прабачэння за тое, што матэрыял не пойдзе ў друк.

— Я ж вас папярэджваў аб гэтым, — адказаў Іосіф Адамавіч, а для "Народнай волі" патлумачыў, што іншага і чакаць не мог.

Па-першае, гэты тэкст не надрукавалі б ужо з-за таго, што я — бацька журналіста Сяргея Навумчыка, які здавён з'яўляецца адным з актывістаў апазіцыі цяперашняму беларускаму рэжыму. А таму і я для казённых СМІ — "персона нон-грата". Па-другое, само існаванне нацыянальнай мовы ў нашай краіне для ўлад — тэма непрыемная, бо афіцыйныя колы робяць усё магчымае, каб звесці выкарыстанне беларускай мовы да нуля, адвучыць ад мовы народ, які з'яўляецца яе стваральнікам і носьбітам.

А таму цяжка перааценіць каштоўнасць таго, што робяць педагогі ў вёсцы Мількі на Браслаўшчыне, дзе існуе, дзякуючы ім, жывы куток Беларушчыны.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

НУ І НУ!

На памяць пра загінуўшага афганца пашкадавалі 30 долараў

Каб зэканоміць 63 000 рублёў, выканкам віцебскага пасёлка Руба ініцыяваў перайменаванне вуліцы імя інтэрнацыяналіста Віктара Дольнікава.

Назву "4-я Лясная" чыноўнікі прызналі "больш зручнай" для мясцовых жыхароў.

"Лясных" вуліц на ўскрайку Рубы ажно дзевяць: "1-я Лясная", "2-я Лясная", "3-я Лясная" і гэтак далей. На "4-й Лясной" у 1961 годзе і нарадзіўся Віктар Дольнікаў, якому ў 23 гады было наканавана лёсам загінуць у Афганістане, падчас тае вайны, якую цяпер нехта лічыць "правільнай", а нехта — наадварот... Меркаваннямі віцебскіх хлопцаў, кінутых пад кулі і бомбы, не цікавіўся ніхто, іх проста забралі "выконваць інтэрнацыянальны абавязак".

Бацькі Віктара Дольнікава амаль дачакаліся вяртання сына: ужо нават была вядомая дата ягонага вылету ў СССР з далёкай усходняй краіны. Але Віктар Дольнікаў вярнуўся ў хату на вуліцы "4-я Лясная" ў цынкавай труне — падмяніў сябра-верталётчыка і быў забіты падчас бою.

— Мне было тады толькі восем год, але я добра памятаю, як на гэтым пахаванні плакала ўся наша вуліца, — расказвае Анжэла Васіленка. — Разам з труной Дольнікава даслалі некалькі чамаданаў з падарункамі, якія падрыхтаваў сваёй сям'і Віктар. Пакуль ён заяваў, у яго нарадзілася дачка —калі яго забіралі ў Афганістан, жонка была цяжарная. Яны загадзя вырашылі, што калі народзіцца дзяўчынка, то назавуць Юляй. Так і атрымалася, толькі ні бацька яе, ні яна бацьку так ніколі і не ўбачылі... А ёйны дзед, бацька Віктара, перажыў сына толькі на пяць месяцаў — сэрца не вытрымала бяды. Цяпер засталася толькі маці, але яна жыве ў іншым месцы: хату, дзе вырас Віктар і адкуль яго завезлі на могілкі, яна прадала.

У самым канцы вуліцы, у доме №9, які некалі належаў Дольнікавым, цяпер жыве Ніна Іванаўна Лапава. Яна распавяла, што 15 год таму мясцовы выканкам прыняў рашэнне перайменаваць вуліцу "4-я Лясная" ў вуліцу імя Дольнікава — дзеля ўшанавання памяці земляка.

— Назву, здаецца, змянілі, але дакументы нікому мяняць не сталі, — гаворыць Ніна Іванаўна, — і ў дамавых кнігах ды тэхнічных пашпартах засталася старая назва. Прапіска ў пашпарце была і такая, і такая — у тых, хто пасяліўся тут нядаўна, напісана "вуліца імя Дольнікава", а ў тых, хто жыў здаўна, засталася "4-я Лясная". Мне дык усё адно, на якой вуліцы жыць. Але цяпер мы амаль што ўсе пенсіянеры, і няма лішніх грошай, каб перарабіць дакументы. У пасялковым выканкаме гэта ведаюць, і таму нядаўна правялі сход, каб афіцыйна вярнуць ранейшую назву.

Старэнькая Вера Мікалаеўна Хачкоўская з дома №8 і сёння не ведае, на якой вуліцы жыве. На ейнай хаце вісіць чыстая белая шыльдачка без адзінай літаркі.

— На сход амаль ніхто не пайшоў: маладзейшыя ў 10 раніцы былі на працы, а ў нас, пенсіянераў, ногі хворыя. А Дольнікавы — сваты мае, мой сын узяў іхную дачку. Але я крыўдую нават не таму, што сваякі мае: гэта ж у Рубе была адзіная вуліца, названая ў гонар нашага жыхара. Тут ёсць толькі "безыменныя" вуліцы — Цэнтральная, Маладзёжная, Гралёўская ... Каб улады дапамаглі нам перааформіць тыя дакументы, падказалі, як гэта зрабіць, дык і было б усё ў парадку. Але ім прасцей вярнуць, як было раней, — гаворыць бабуля, ужо не спрабуючы стрымаць слёзы.

Старшыня Рубаўскага пасялковага выканкама Міхаіл Шаблакоў сцвярджае, што старая назва больш зручная для мясцовых жыхароў, і таму яе вяртаюць. У якасці "кампенсацыі" на хаце, дзе вырас Віктар Дольнікаў, мясцовыя ўлады прапануюць павесіць мемарыяльную дошку. Прынамсі, згоду на гэта ад цяперашняй гаспадыні ў выканкаме атрымалі яшчэ паўгода таму.

У віцебскім Бюро тэхнічнай інвентарызацыі, якое займаецца перааформленнем дакументаў, паведамілі: унясенне выпраўленняў каштуе усяго сем тысяч з кожнага домаўладальніка. З улікам таго, што на вуліцы імя Дольнікава ўсяго 9 дамоў, годнае ўшанаванне памяці земляка каштавала б мясцоваму выканкаму ўсяго 63 тысячы рублёў. Цяпер выправіць туповую сітуацыю са зваротным перайменаваннем мясцовым уладам куды цяжэй: даведаўшыся пра інцыдэнт у Рубе, былыя воіны-афганцы — сябры грамадскага аб'яднання "Братство" пішуць скаргі ва ўсе інстанцыі, вінавацяць выканкам у ідэалагічнай недальнабачнасці і проста ў адсутнасці чалавечага сумлення.

Алена ШТРАЛЬ,
www.bulletinonline.org

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Новы падатак на сялян

Дадатковую крыніцу фінансавання аўральнай падрыхтоўкі да чарговых "Дажынак", маючых адбыцца ў Оршы, знайшлі мясцовыя бюракраты.

На нядаўнім пасяджэнні Аршанскага райвыканкама з удзелам старшынь сельсаветаў падводзіліся вынікі падрыхтоўкі да восеньскага фэсту ў гонар перадавікоў працы на зямлі. Галоўная адметнасць штогадовага рэспубліканскага свята — прысутнасць на ім прэзідэнта А.Лукашэнкі разам з іншымі высокімі гасцямі.

Нават дзеля звычайных гасцей хату прыбіраюць, а перад такімі немагчыма пасці тварам у бруд.

На пасяджэнні адзначалася, што вяскоўцы Аршаншчыны неахвотна ўпарадкоўваюць свае сядзібы да свята, і сталічных гасцей можа непрыемна ўразіць выгляд вёсак раёна. Не паўсюдна фарбуюцца платы, марудна рамантуюцца старыя збудаванні, размешчаныя паабапал бальшакоў, па якіх можа прыехаць абласное і сталічнае кіраўніцтва. Шмат дзе не прыбіраюцца нават гной і салома побач з дарогай.

Раённае начальства запатрабавала ад старшынь сельсаветаў актывізаваць працу з насельніцтвам з дапамогай прымусу: калі гаспадары вясковых сядзіб не будуць хутка і якасна выконваць даведзеныя кожнаму заданні па навядзенні парадку, неабходна прымяняць да іх штрафныя санкцыі.

Такая пастаноўка пытання не выклікала паразумення ў кіраўнікоў вясковай улады. Было відаць, што старшыні сельсаветаў, з'яўляючыся народнымі абраннікамі, не хочуць канфліктаваць са сваімі выбаршчыкамі, а тым больш — з аднавяскоўцамі або нават сваякамі.

— Я не магу накладваць штрафы на нямоглых і бедных пенсіянераў, — выказалася адна з прысутных старшынь Саветаў ніжэйшага звяна. — Я давяла да людзей больш за 200 прадпісанняў, а больш пакуль нічога зрабіць не магу. Буду яшчэ хадзіць па хатах, пераконваць, але наконт штрафаў нават гаварыць баюся: нашы людзі ўвогуле паслухмяныя, але калі пакрыўдзяцца, і прымусам нічога рабіць не будуць.

Тым не менш кіраўніцтва райвыканкама працягвала гнуць сваю лінію, і напрыканцы пасяджэння прагучала-такі распараджэнне аб тым, каб тых вяскоўцаў, хто не выконвае заданні па добраўпарадкаванні сядзібаў, караць за гэта рублём.

Праўда, у якіх памерах караць і ці рабіць для каго-небудзь палёгку, у той раз так і не было вызначана.

Канчатковае рашэнне "праблемы" перанесена на наступнае пасяджэнне выканкама.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

СВЕТЛАЯ ПАДЗЕЯ

Унікальнасць «ЕўраСлоўніка» і яго аўтара

Як паведамляла "Народная воля", у выдавецтве "Радыёлаплюс" выйшаў у свет "ЕўраСлоўнік" Лявона Баршчэўскага. Выданне гэта з усіх пунктаў гледжання унікальнае не толькі ў беларускай, але і ў сусветнай лексікаграфіі; унікальнае яно — планетарна. "ЕўраСлоўнік" напаўняе лексіка з 28 моў еўрапейскага кантынента (беларуская, лацінская, англійская, балгарская, венгерская, грэчаская, дацкая, ірландская, ісландская, іспанская, італьянская, латышская, літоўская, мальтыйская, нарвежская, нідэрландская, нямецкая, партугальская, польская, румынская, славацкая, славенская, фінская, французская, харвацкая, чэшская, шведская, эстонская) і каля 100.000 адзінак перакладу ў пералічанай лінгвапрасторы. "Слоўнік" набліжае нашу мову да ўдзячных чытачоў беларускіх тэкстаў у краінах Паўночнай, Цэнтральнай, Заходняй і Паўднёвай Еўропы. Удзячны карыстальнік, і беларускі таксама, набывае тут неацэнную мажлівасць ісці ў багаты свет еўрапейскіх моў і сэнсаў, якія стаяць ці могуць стаяць за імі. Вялікая колькасць адзінак перакладу — гэта своеасаблівы ключ, узор для чытання і разумення інфармацыйнай, публіцыстычнай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры ў друкаваным выглядзе ці ў Сеціве.

Кола карыстальнікаў дадзенага выдання — самае шырокае, але перадусім яно адрасуецца маладзейшаму пакаленню беларусаў, якія будучыню Беларусі бачаць сярод народаў аб'яднанай Еўропы.

Праглядаючы "ЕўраСлоўнік" Л.Баршчэўскага, а таксама прадмовы і табліцы да яго, нельга не ўспомніць такія сусветна славутыя імёны, як П.Шафарыка, А.Міцкевіча і і іншых, якія навукова абгрунтавана і з душэўнай цеплынёй гаварылі аб беларускай мове. Варта нагадаць для тых, хто адмаўляе права на гістарычнасць, самабытнасць і самастойнасць беларускай мовы, што наша мова па вызначэнні бацькі чэшскага і славацкага нацыянальнага адраджэння, геніяльнага славіста П.Шафарыка мае звыш дзесяці асаблівасцяў, якія адрозніваюць яе ад іншых славянскіх моў. На адну такую асаблівасць у свой час звяртаў увагу і А.Міцкевіч, калі сцвярджаў, што беларуса (ліцвіна), які ўжо нібыта развітаўся з беларускасцю, можна пазнаць яшчэ дзесь ці не ў сёмым пакаленні. Класік сусветнай літаратуры меў на ўвазе такую фанетычную асаблівасць беларускай мовы, як дзеканне, што, вядома, закладзена ў артыкуляцыйным апараце беларуса.

Маючы мажлівасць параўноўваць у самых розных аспектах беларускае слова з яго адпаведнікамі ў 27 еўрапейскіх мовах (варта было б абазначыць у "ЕўраСлоўніку" ўкраінскую і расійскую прысутнасць), мы пераконваемся, што яно, слова наша, ніколькі і ні ў чым не саступае еўрапейскім аналагам-сінонімам, а часам і пераўзыходзіць іх сваёй мілагучнасцю, падтэкставасцю, філасафічнасцю, настраёвасцю, манеўранасцю і мабільнасцю.

Неабходна яшчэ заўважыць, што гэты варыянт "ЕўраСлоўніка" — дапрацаванае, перш за ўсё з улікам патрэб беларускіх карыстальнікаў, выданне (перавыданне) "Беларуска-лацінска-еўрапейская слоўніка", выпушчанага Калегіумам Усходняй Еўропы ў Польшчы (Уроцлаў). Аўтар, вядома, той жа Лявон Баршчэўскі. Паказальна яшчэ на карысць аўтара і выдання, што яны мелі групу рэдактараў (каля васьмі па замежнай частцы і некалькі — па беларускай). Шчырая ім (рэдактарам) удзячнасць ад аўтара і, вядома, ад карыстальнікаў "Слоўніка".

Звяртаючы ўвагу на незвычайнасць "Слоўніка" Л.Баршчэўскага, нельга не звярнуць увагу на унікальнасць асобы самога аўтара гэтага выдання. Без усялякіх агаворак можна смела сцвярджаць, што Лявон Баршчэўскі — гэта наш нацыянальны набытак. Ён свабодна размаўляе на сямі мовах. Як перакладчык Л.Баршчэўскі перакладаў паэзію больш як з 30 моў, а прозу — больш як з дзесяці. Яго талент і рука пераўвасобілі на нашу мову творы Эсхіла, Петраркі, Кафкі, Брэхта, Ленау, Бёля і іншых. Стала ён перакладае са старажытнагрэчаскай, лацінскай, нямецкай, англійскай, французскай, польскай, іспанскай моў. Перад намі паліглот-фундаменталіст. Можна не сумнявацца, што такіх людзей (якія працавалі б з такой колькасцю моў) не знойдзеш у Беларусі ні ў так званай Палаце прадстаўнікоў (каго яны там прадстаўляюць?), ні ў так званай Палаце сенатараў (тут, як і ў першай структуры, не чуваць беларускага слова), ні ў Савеце міністраў, ні ў Адміністрацыі прэзідэнта, ні сярод акадэмікаў НАНБ і г.д. Там усюды пераважна карыстаюцца мовай-трасянкай (вось пару яе ўзорчыкаў: замест кроп, укроп вымаўляюць вкроп; замест время — урэмя і гэтак далей і да таго падобнае і да бясконцасці) ну і, канечне, расійскай мовай, на якой некаторыя з акадэмікаў і генералаў папісваюць і выдаюць нібыта вершы і нібыта прозу. Такім чынам, месца беларускай мове ні ў заканадаўчай, ні ў выканаўчай, ні ў судовай уладах (у апошняй карыстанне падсудным родным словам расцэньваецца як нецэнзурная лаянка) і іншых, залежных ад іх структурах і надбудовах, — няма.

А ці знаёмы з мовай-трасянкай Лявон Баршчэўскі? Несумненна. Было б выдатна, каб ён склаў на падзіў, пацеху і ў выхаваўчых мэтах "Слоўнік-трасянку", куды пайменна ўвайшлі б для гісторыі беларускага лінгвацыду галоўныя носьбіты і ахоўнікі гэтай пачварнай з'явы.

Відавочна, у асобе Л.Баршчэўскага беларуская моўная прастора мае аднаго са сваіх абаронцаў ад лінгвацыду, аднаго з тых, чыімі намаганнямі мы не выпадаем з еўрапейскага і сусветнага лінгвакантэксту, прынамсі, для свядомых і культурных людзей.

Лявон Баршчэўскі — кандыдат філалагічных навук, член Саюза беларускіх пісьменнікаў, рэдактар серыі "Biblioteka belaruska" (Калегіум Усходняй Еўропы), адзін са стваральнікаў клуба маладых перакладчыкаў "Бабілён". Ён — заснавальнік і намеснік дырэктара Беларускага гуманітарнага ліцэя, які быў зачынены ўладамі ў 2003 годзе і які ўсё ж існуе, хай сабе і напаўпадпольна. Навучэнцы ліцэя — выключная моладзь! У іх праасветленыя душы і твары. Выпускнікі гэтай навучальнай установы стопрацэнтна паступаюць у ВНУ па ўсім свеце.

У мінулым Л.Баршчэўскі — народны дэпутат БССР (апазіцыянер); сёння — старшыня Партыі БНФ і ГА БНФ "Адраджэнне".

Вось далёка не поўны, як кажуць, паслужны спіс Лявона Баршчэўскага. Трэба дзіву давацца, што яшчэ ў нашай духоўнай ды і матэрыяльнай пустэльні з'яўляюцца такія людзі. І з кожным годам іх усё больш. Асабліва — маладых. Праўда, трэба яшчэ мець мужнасць, каб у такой якасці ды і засвяціцца. Тут такое небяспечна. А Л.Баршчэўскі, як і некаторыя з моладзі, — адважваецца. Толькі вось доступу да дзяржаўных СМІ, на якія і самі плацяць падаткі, яны не маюць. У нашай геаграфічнай прасторы і нашым постскрыптумным часе такіх прыўладдзе ненавідзіць.

Але вернемся да "ЕўраСлоўніка". Асабіста я ў пэўным сэнсе шчаслівы чалавек, што мой кнігазбор і мой стол упрыгожыла гэтае выданне. Прыгожае яно яшчэ і з пункту гледжання тэхнічнага, мастацкага і паліграфічнага афармлення і выканання. Карацей, перад намі твор ва ўсіх сэнсах высокай культуры і кшталту.

Яўген ГУЧОК.

Народная Воля http://www.nv-online.info
22 МАЯ 2008 г.

УВАГА!

У беларускіх музычных магазінах не прадаюцца дыскі ансамбля «Бяседа»

